ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 19 (2276)
5 сакавіка 1968 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НАСУСТРАЧ СЛАЎНАМУ ЮБІЛЕЮ

Надыходзіць знамянальная дата ў гісторыі беларускага народа: з дня ўтварэння БССР і Камуністычнай партыі Беларусі спаўняецца пяцьдзесят гадоў. Блізкі подых вялікага свята адчуваецца ўжо ў павышаным рытме працоўнага жыцця рэспублікі, у змесце і напрамку работы ідэалагічных устаноў, у творчых планах і пошуках майстроў літаратуры і мастацтва, арміі мастацкай самадзейнасці, ва ўсіх нашых буднях. Па добрай народнай традыцыі рэспубліка прысвячае свайму юбілею новыя дасягненні ў барацьбе за росквіт эканомікі і культуры.

Пяцьдзесят пройдзеных гадоў — гэта не проста «круглая лічба» ў біяграфіі рэспублікі. За імі—эпоха велізарных пераўтварэнняў, якія перайначылі аблічча нашай зямлі і духоўны свет беларускага народа. За імі—ажыццяўленне спрадвечнай народнай мары аб сацыяльным і нацыянальным разняволенні, аб праве «людзьмі звацца».

У апублікаванай гэтымі днямі пастанове ЦК КПБ «Аб 50-годдзі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» падкрэсліваецца, што беларускі народ разглядае надыходзячае свята як працяг урачыстасцей, звязаных са слаўным паўвекавым юбілеем Кастрычніка. І ў гэтым яго глыбокі гістарычны сэнс. БССР — дзецішча Вялікага Кастрычніка, які вывеў працоўных на шырокую дарогу будаўніцтва новага жыцця, прынёс беларускаму народу вызваленне ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, стварыў умовы для вырашэння пытання аб сваёй нацыянальнай сацыялістычнай дзяржаўнасці, свабоднага развіцця культуры і эканамічнага працвітання. Утварэнне яе з'явілася адным з пераканаўчых сведчанняў трыумфу ў нашай краіне прынцыпаў пралетарскага інтэрнацыяналізму, паслядоўнага ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі. Беларусь заняла сваё пачэснае месца ў братнім дабраахвотным аб'яднанні рэспублік Савецкага Саюза, згуртаваных адзінствам інтарэсаў і імкненняў. З дружбай савецкіх народаў, з іх узаемнай братняй падтрымкай і дапамогай мы звязваем усе нашы дасягненні, заваяваныя за гэтае паўстагоддзе.

ЦК КПБ нагадвае ў сваёй пастанове важнейшыя старонкі гісторыі Савецкай Беларусі, і мы бачым, з якой магутнай сілай забурліла разняволеная Кастрычнікам, ленінскай партыяй творчая энергія народа, як імкліва пайшлі ўгору яго эканоміка і культура. За кароткі перадваенны час Беларусь пакончыла са спрадвечнай эканамічнай адсталасцю, — была праведзена сацыялістычная індустрыялізацыя рэспублікі, вёска стала на шлях калгаснага жыцця. Велізарныя пераўтварэнні адбыліся ў галіне культуры, духоўнага жыцця народа. Тэрыторыя рэспублікі пакрылася густой сеткай агульнаадукацыйных школ, тэхнікумаў і вну, навукова-даследчых і культурна-асветных устаноў. Вольна і шырока загучала беларускае мастацкае слова, народ стварыў свой прафесіянальны тэатр, сваю кінематаграфію, расквітнелі беларуская музыка і выяўленчае мастацтва. Сярод самых знамянальных і радасных падзей гэтых гадоў мы ўспомнім сёння і верасень 1939 года, калі адбылося ўз'яднанне ўсяго беларускага народа ў адзінай Савецкай Рэспубліцы.

У чорную часіну фашысцкай навалы працавіты і міралюбівы беларускі народ стаў мужным і грозным воінам, паказаў сваю бязмежную адданасць савецкаму ладу, справе Камуністычнай партыі. Больш як мільён сто тысяч беларусаў змагаліся ў радах Савецкай Арміі, а на захопленай ворагам беларускай зямлі з краю ў край шугала полымя партызанскай барацьбы. Гэта было змаганне за наш сённяшні дзень і нашу будучыню. Народ адстойваў самыя дарагія заваёвы, без якіх ён не ўяўляе свайго існавання.

Да слаўнага юбілею рэспублікі беларускі народ прыходзіць з дасягненнямі, якія выклікаюць пачуццё гордасці і захаплення. Далёкай гісторыяй сталі ўжо даваенныя рубяжы эканамічнага развіцця, хоць, як вядома, пасля фашысцкага нашэсця нам даводзілася, па сутнасці, пачынаць усё спачатку. Узніклі многія новыя галіны прамысловасці: мы будуем цяпер трактары і аўтамабілі, ствараем электронныя машыны і дакладныя прыборы, здабываем і перапрацоўваем нафту, выпускаем мінеральныя ўгнаенні і сінтэтычныя валокны... Змянілася аблічча нашых гарадоў, узнятых з папялішчаў вайны. Перадавая сучасная тэхніка прыйшла ў вёску, сельская гаспадарка рэспублікі стала высакаразвітай галіной сацыялістычнай вытворчасці.

Беларускі народ, гаворыцца ў пастанове ЦК КПБ, з упэўненасцю глядзіць у сваю будучыню, аддаючы ўсе свае сілы і працоўную энергію справе будаўніцтва камунізма ў нашай краіне. Натхніцелем і арганізатарам усіх яго выдатных перамог і здзяйсненняў выступае Камуністычная партыя Беларусі — адзін з баявых атрадаў КПСС. Яна пастаянна выхоўвала працоўных у духу палымянага савецкага патрыятызму, пралетарскага інтэрнацыяналізму, пастаяннай гатоўнасці да абароны сацыялістычнай Айчыны. Камуністы ішлі ў перадавых радах і ў час ваенных выпрабаванняў, і ў барацьбе за выкананне планаў мірнага будаўніцтва.

Цэнтральны Камітэт КПБ пастанавіў правесці пяцідзесятую гадавіну Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі — вялікае свята беларускага народа, свята перамогі ленінскай нацыянальнай палітыкі, маналітнага адзінства і дружбы народаў СССР — пад знакам далейшага павышэння палітычнай і працоўнай актыўнасці рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі, усіх працоўных рэспублікі, мабілізацыі іх сіл і творчай энергіі на паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXIII з'езда КПСС.

У пастанове ЦК КПБ намечана шырокая праграма падрыхтоўкі да слаўнага юбілею. Пачэсная роля адведзена ў ёй органам і ўстановам культуры, творчым саюзам, друку, радыё, тэлебачанню, шматлікай арміі мастацкай самадзейнасці.

ЦК КПБ ставіць задачу ўзмацніць работу па прапагандзе ідэй пралетарскага інтэрнацыяналізму і савецкага патрыятызму, глыбока раскрываць жыватворную сілу ідэй марксізма-ленінізма, сусветна-гістарычнае значэнне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі для лёсу беларускага народа, выдатныя дасягненні працоўных рэспублікі і краіны ва ўсіх галінах эканамічнага і культурнага будаўніцтва за гады Савецкай улады. Неабходна, гаворыцца ў пастанове, забяспечыць далейшае развіццё і ўмацаванне ў жыцці народа рэвалюцыйных і працоўных традыцый, садзейнічаць фарміраванню высокіх маральных якасцей, камуністычных адносін да працы і сацыялістычнай уласнасці, вернасці камуністычным ідэалам, выхаванню ў працоўных непрымірымых адносін да буржуазнай ідэалогіі, пастаяннай гатоўнасці да абароны інтарэсаў сваёй сацыялістычнай Айчыны.

Ганаровы абавязак дзеячоў літаратуры і мастацтва — прыйсці да юбілею з новымі творамі, якія б поўна і ярка адлюстроўвалі гераічную гісторыю беларускага народа, глыбока раскрывалі духоўны свет і патрыятычныя справы нашага сучасніка — чалавека, выхаванага Камуністычнай партыяй і савецкім ладам. Клопатамі аб высокім ідэйным і мастацкім узроўні кніг, кінафільмаў, спектакляў, твораў выяўленчага мастацтва і музыкі, прысвечаных юбілею, павінна быць прасякнута ў гэты час жыццё творчых саюзаў і арганізацый.

Вялікае кола важных юбілейных мерапрыемстваў належыць ажыццявіць органам Міністэрства культуры і Дзяржаўнаму камітэту Савета Міністраў БССР па друку — арганізацыям і правесці юбілейныя фестывалі, конкурсы і агляды прафесіянальных і самадзейных калектываў і выканаўцаў, выстаўкі твораў літаратуры, фатаграфіі, выяўленчага мастацтва і г. д. Адказныя задачы вынікаюць з пастановы ЦК КПБ для органаў кінематаграфіі, выдавецтваў, клубаў, бібліятэк, дамоў культуры, дзяржаўных і народных музеяў. Выкананне іх патрабуе высокай творчай ініцыятывы, нястомных пошукаў. Добрай падмогай будзе тут багаты вопыт, накоплены працаўнікамі культурнага фронту ў час падрыхтоўкі да пяцідзесяцігоддзя Вялікага Кастрычніка.

Слаўнаму юбілею рэспублікі — нашы лепшыя задумы, наш творчы запал і натхненне!

Кожны дзень з Мінскага аўтамабільнага завода адпраўляюцца ў дарогу прыгажуны-машыны з крутарогімі зубрамі на радыятарах.

Магутны матор, грузападымальнасць, надзейнасць у эксплуатацыі і... прыгажосць — вось што вылучае нашы аўтамабілі і зрабіла іх папулярнымі ў 42 краінах свету.

Прыгажосць МАЗ'аў нараджаецца тут, у бюро мастацкага канструявання завода.

Вы бачыце начальніка бюро Аляксандра Міхайлавіча Першына і мастака-канструктара Валянціну Благарэнка. Яны атрымалі чарговае заданне. Яшчэ адна зручнасць з'явіцца ў волата-прыгажуна.

Фота Э. ТРАГУБОВІЧА.

ПРАФСАЮЗНЫ ФОРУМ КРАІНЫ

З 27 лютага па 4 сакавіка 1968 года ў сталіцы нашай радзімы — Маскве праходзіў XIV з'езд прафесіянальных саюзаў СССР — самай масавай арганізацыі, якая аб'ядноўвае ў сваіх радах больш 80 мільёнаў чалавек.

З прывітаннем да дэлегатаў з'езда і ў іх асобе да гераічнага рабочага класа, усіх працоўных краіны—будаўнікоў камунізма звярнуўся Цэнтральны Камітэт КПСС.

Дэлегаты з'езда абмеркавалі справаздачу Усесаюзнага Цэнтральнага Савета Прафесіянальных Саюзаў, справаздачу Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

З'езд выбраў новы склад ВЦСПС і Цэнтральнай рэвізійнай камісіі. Старшынёй ВЦСПС выбран член Палітбюро ЦК КПСС А. М. Шалепін.

РАЯЦЦА КАМПАЗІТАРЫ

У Саюзе кампазітараў БССР адбыўся адкрыты партыйны сход, на якім абмеркаваны мерапрыемствы саюза і творчыя планы кампазітараў да 50-годдзя рэспублікі і Кампартыі Беларусі. Даклад зрабіў сакратар партарганізацыі І. Кузняцоў. У спрэчках выступілі Я. Цікоцкі, Я. Глебаў, Г. Вагнер і Л. Абеліёвіч, прадстаўнікі Вялікага тэатра оперы і балета Г. Дугашаў і А. Дадзішкіліяні, начальнік ваенна-аркестравай службы ВВА Б. Пянчук, музыказнаўцы В. Сізко і С. Нісневіч, мастацкі кіраўнік народнага хору БССР Г. Цітовіч, галоўны рэдактар музычнага вяшчання Беларускага радыё Д. Жураўлёў.

На сходзе былі закранутыя надзённыя пытанні творчага жыцця кампазітарскай арганізацыі, ішла размова пра новыя творы і іх выкананне філарманічнымі калектывамі, самадзейнасцю, пра прапаганду дасягненняў беларускай музыкі па радыё, пра ўзбагачэнне рэпертуару ў розных жанрах. Адзначалася, што Саюз кампазітараў пакуль што недастаткова паслядоўна ўмацоўвае сувязі аўтараў твораў буйных форм з вядучымі музычнымі калектывамі рэспублікі. У прыватнасці, указвалася на тое, што з 1960 года, пасля пастаноўкі «Калючай ружы» Ю. Семянякі, на тэатральнай сцэне не было паказана ніводнага арыгінальнага нацыянальнага спектакля (опера «Алеся» ішла толькі ў новай музычнай рэдакцыі). Няма новых твораў для такіх цікавых калектываў, як струнны квартэт Саюза кампазітараў БССР, камерны аркестр філармоніі. Недастаткова актыўна ўзбагачаецца рэпертуар харавых ансамбляў, якія адчуваюць патрэбу ў жартоўных, маладзёжных песнях і г. д.

Прамоўцы гаварылі і пра тое, што саюз павінен заўсёды прынцыпова аналізаваць творы вопытных і маладых аўтараў, браць на сябе адказнасць рэкамендаваць іх да выканання лепшымі калектывамі рэспублікі. Закраналіся і пытанні папаўнення новым таленавітымі артыстамі опернай і балетнай трупы нашага тэатра, сімфанічнага аркестра.

Начальнік Упраўлення па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР І. Палівода расказаў на сходзе пра тыя захады, што прымаюцца, каб актывізаваць работу канцэртных арганізацый, тэатраў і кампазітараў, заклікаў прысутных сустрэць 50-годдзе БССР і Кампартыі Беларусі новымі дасягненнямі ва ўсіх галінах музычнага мастацтва.



Чалавек і прыгода

КАБ ЗЯМЛЯ КВІТНЕЛА САДАМІ

М. КУТНЯВЕЦКІ

НЕЯК у канцы лета са старшынёй калгаса імя Куйбышава Іванам Навумавічам Шахновічам аб'язджалі мы арцельныя палеткі. Старшыня частаваў мяне духмяным «апортам», грушамі-«цукроўкамі». А потым сказаў:

— Мо на вінаград з'ездзім? — Іван Навумавіч паглядзеў на мяне і засмяяўся. — Я не жартую. Самі ўбачыце, — і загадаў шафёру. — Да Андрэя Цімафеевіча, у Паўлаўку. Эге ж, браце, — працягваў ён, — Андрэй Цімафеевіч — славуты чалавек. Гэта, можна сказаць, наш мясцовы Мічурын, светлая галава, а яму ж восемдзесят восем стукнула...

Праз паўгадзіны «газік» спыніўся ля невялікай хаціны ў густым зарасніку вішняку, бэзу, язмену. Нас сустрэў яшчэ бадзёры дзед з сівой барадой і цікаўнымі, жывымі вачыма.

— Няма чаго ў хаце рабіць, айда ў сад, — сказаў гаспадар.

У такім садзе мне яшчэ не даводзілася бываць. Мо з гадзіну паказваў нам Андрэй Цімафеевіч вінаград, якога тут было дваццаць сем гатункаў, розныя яблыні, грушы, парэчкі. Мы ледзь паспявалі з'есці адно яблыка, як дзед частаваў другім, «смачнейшым» («Гэта ранет курскі — ружовы, да мая ляжыць. А вось груша—«добрая Луіза», мне з Мічурынска прыслалі гэты гатунак»...)

Жонка Андрэя Цімафеевіча Ганна Архіпаўна тым часам наклала поўную талерку вінаграду і папрасіла «не саромецца, каштаваць». А Андрэй Цімафеевіч усё расхвальваў розныя гатункі, знаёміў нас з іх «радаслоўнай».

— Хто ў нас займаецца вінаградарствам? Доследнікі ў асноўным. У нас на Случчыне такіх з дзесятак знойдзецца. Думаюць многія, што не саспее ў нас вінаград. Няпраўда! У нас, сынкі, хапае і сонца, і цяпла. Было б жаданне, ну і, вядома, уменне.

Прайшло з той сустрэчы нямала дзён, а я ўсё не пераставаў думаць пра яе. Бывае, сустрэнеш чалавека, пазнаёмішся, здаецца, добра, а адышоў і забыўся. А з другім словам якім перакінуўся, а адчуваеш — кранула тваё сэрца.

І вось я зноў у Паўлаўшы. Задуменна стаяць у снезе дрэвы. Глуха шумяць вакол сядзібы Андрэя Цімафеевіча пасаджаныя ім елкі. Шырокая сцежка вядзе да ганка. Разам са мной пратупаў па ёй калгасны паштальён. Потым я даведаўся, што прынёс ён гаспадару бандэроль з Усурыйскага краю, з горнатаёжнай станцыі.

— Заказаў я кітайскага лімонніку, вінаграду «альфа»,— гаворыць Андрэй Цімафеевіч, знімаючы з носа акуляры. — Прыслалі ўсяго пакрысе. І абліпіхі, і абрыкосу манчжурскага. Хачу сынок, сёлета да нашай сасны прышчапіць кедр сібірскі. У звычайных умовах кедр пладаносіць праз трыццаць гадоў. А калі яго скрыжаваць з сасной, дык уродзіць праз сем-восем...

Мы сядзім за сталом і гутарым. І слова за словам даведваюся я пра дзівосную гісторыю адной, адзінай на ўсё жыццё любві — любві да зямлі, да прыроды.

— Калісь я працаваў на пошце ў Данбасе. Пагнала з Беларусі галеча, беззямелле. А калі ў дваццаць першым там голад настаў, мы з Ганнай Архіпаўнай сабраліся і прыехалі ў Паўлаўку. Прывёз я тады некалькі катахоў кукурузы. Пасадзіў у агародчыку. Улетку сяляне прыходзілі, дзівавалі. Ніхто ж ніколі тады той кукурузы не бачыў. І мінеральных угнаенняў прывёз трохі. Аміячкі, здаецца. Мужыкі глядзелі на яе, чухалі патыліцы, пасмейваліся. «Мудрае Барысавец з гэтым парашком. Калі няма гною, дык ніякі парашок не дапаможа». А ўвосень тыя ж мужыкі-скептыкі прыходзілі да мяне ў агарод паглядзець на вялізныя клубні бульбы, якія выраслі на тым «парашку»... У мяне быў свой доследны ўчастак. Вырошчваў я васемнаццаць гатункаў жыта, восем — аўса, дзесяць — ячменю, некалькі — бульбы. У 1923 годзе з аднаго карча выкапаў 14 кілаграм бульбы. Уся вёска збеглася...

Гэты рэкорд быў нават зарэгістраваны ў спецыяльным акце сельсавета. Мне тады першую ўсебеларускую прэмію далі за вывядзенне лепшых гатункаў збажыны і бульбы.

...Мова ў майго субяседніка сакавітая, багатая, параўнанні вельмі трапныя. Гаворка яго нібы з гумарком, нібы сам з сябе пасмейваецца... Я слухаю яго, і перад маімі вачыма бяжыць год за годам чужое, не, цяпер здаецца, і не чужое жыццё.

Калектывізацыя нібы расправіла крылы няўрымслівраму шукальніку. Ён ідзе брыгадзірам садова-гароднай брыгады і ўжо ў 1937 годзе атрымлівае па 800 цэнтнераў капусты з гектара — небывалы на той час ураджай. Асобныя качаны важылі да 25 кілаграмаў. А гарбузы! Як на дзіва якое ішлі людзі глядзець! Па 40 кілаграмаў! (У пасляваенныя гады з такімі гарбузамі Андрэй Цімафеевіч ездзіў на Выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі СССР).

— Андрэй, Цімафеевіч, чуў я, што ў вас нават свой лес ёсць?

Стары ўсміхаецца.

— Свой? Ну, няхай «свой», Гэта ля вёскі Бранава. О, там сосны, цяпер — як рукамі ахапіць. Лісы ўжо водзяцца. Грыбоў, ягад улетку — касой касі. А да трыццаць дзевятага на тым месцы курэла пылам гара... Я ў той год старшынёй калгаса працаваў. Сабраў сялян і кажу: «Спрадвеку нас завуць паляўцамі. А таму, што не расце ў нас ні кусціка, — стэп ды стэп. Дык можа пасадзім лес? Загулі сяляне. Чакай, кажуць таго лесу, пакуль ён вырасце. Нам цяпер трэба. А вашым дзецям, унукам, кажу, не патрэбны будзе? Пераканаў. Паехалі ў лясніцтва, назбіралі два вазы хваёвых шышак. Тры дні прапавалі. Васемнаццаць гектараў пасадзілі...

Стары сказаў, што лес гэты назвалі «Андрэевым».

Кожную восень, узяўшы за руку суседскага хлапчука Васілька, ідзе Андрэй Цімафеевіч у «свой» лес. Абыдзе ўсю дзялянку, пазбірае ламачча, бляшанкі, бутэлькі. А пад вечар з кошыкам баравікоў, бабак, павесялелы і бадзёры вяртаецца дамоў:

— Ты, дзядусь, сёння добры такі...

Вось так і бывае. Адзін, глядзіш, не ўцерпіць, каб проста так, бо рукі зачасаліся, не зламаць дрэўца, другі ўсё жыццё ўпрыгожвае зямлю садамі і лясамі. І мне раптам хочацца сказаць Андрэю Цімафеевічу нейкія асаблівыя словы ўдзячнасці, і тут жа адчуваю, як цяжка словамі выказаць пачуцці.

Андрэй Цімафеевіч вымае вялізную папку з паперамі. Гэта яго перапіска з садаводамі-аматарамі, як кажуць, з усяго свету. Харкаў і Барнаул, Уладзівасток і Мічурынск, Разань і Ерэван. Ну, а з бліжэйшых мясцін да яго проста прыязджаюць па саджанцы, па вопыт, за парадай...

— Не раз гаварыў нашым кіраўнікам: бярыце ў мяне саджанцы, абсаджвайце дарогі яблынямі, слівамі, вішняком, язменам, алычой. Чаму ў нас цягнуць на дарогі толькі таполю? Калі ўжо хочаце дэкаратыўныя дрэвы, то ці не лепей было б язмен або акацыю садзіць? Гэта ж мядовыя дрэвы, раздолле для пчол... Слухаюць мяне, згаджаюцца. А да справы рукі не даходзяць... А прыродзе, ёй, бачыце, рукі працавітыя патрэбны ды любоў вялікая. У майго суседа сынок, Васілёк, любіць дапамагаць мне ў садзе. І яблыкамі, вінаградам таксама ласавацца любіць. А спытаў у яго аднойчы, кім ён хоча быць, як вырасце? Інжынерам, кажа. І інжынеры, вядома, патрэбны вельмі. Але ўсё інжынеры ды інжынеры, а хто дрэвы садзіць будзе?

Я падыходжу да этажэркі з кнігамі. Наверсе ляжыць «Жніво жыцця» Лютэра Бербанка. Стары бярэ ў мяне з рук невялічкую кнігу ў парыжэлым пераплёце (у дваццаць дзевятым годзе купіў на вакзале ў Смаленску) і па памяці пачынае цытаваць цэлыя старонкі, з густа падкрэсленымі алоўкам радкамі з запісамі на палях.

— Кожны чалавек, — гаворыць Андрэй Цімафеевіч, — звычайна выбірае сабе дарогу на ўсё жыццё. Тую, што выбраў я, усё жыццё прыносіла мне радасць. Адным словам, не шкадую, што такая выпала мне доля. Адно крыўдна— многае, адчуваю, не паспею зрабіць... Трэба спяшацца. Вось хачу ўгаварыць нашых кіраўнікоў развесці драсён. Што гэта такое? Меданос, на кукурузу падобны. У ім вітаміну С больш, чым у шыпшыне, чым у яблыку. Можа ісці і на сілас. За лета выпастае да трох-чатырох метраў. І, галоўнае, не патрабуе вялікіх затрат на ўгнаенні, догляд...У мяне ёсць насенне драсёну сахалінскага. Трэба будзе са старшынёй параіцца...

Блакітныя чыстыя вочы Андрэя Цімафеевіча поўныя жывой думкі. Ён дастае з паліцы чатырохтомнік Мічурына, цэлы стос кніг па садоўніцтву. Пералістае, пытае, а я гляджу на яго і думаю: ці не гэтая ўлюбёнасць у зямлю, анантанасць, якую чалавек пранёс праз усё жыццё, і далі яму даўгалецце, захавалі ясны розум. І яшчэ я думаў пра тое, што вось у нас часта выпускаюць плакаты і лістоўкі пра даярак, пастухоў, прапагандыстаў, настаўнікаў, клубных работнікаў і г. д. Лічбы, даты, параўнанні — і плакат гатовы. Я не кажу, што пра іх не трэба пісаць (праўда, не так сумна); але вось ніхто не дадумаецца прыехаць да гэтага чалавека мудрага веку, запісаць яго гутарку і выпусціць яркі жывы плакат. Няхай бы гэта была споведзь чалавека, улюбёнага ў прыроду, чалавека, які аддаў ёй усё жыццё. Які прыклад для моладзі!

Позна вечарам я пакідаў утульны дамок садоўніка. Ганна Архіпаўна запіхвала мне ў кішэні духмяныя, халодныя са сцлепа — яблыкі. А Андрэй Цімафеевіч паўтараў:

— Вы ж не забудзьце прыехаць у чэрвені, як трускаўкі паспеюць. Іх у мяне гатункаў дзесяць. А ў канцы жніўня — у вінаград прыязджайце. Якраз мускат чырвоны паспее. Гасцямі будзеце. І мне, старому, весялей...

Цяпер у яго садзе галінкі дрэў увешаны тысячамі пацерак-лядзяшак. А прыйдзе пара, і вясна налье дрэвы свежай сілай, выб'ецца густой лістотай, абаўе дамок садоўніка гнуткімі сцяблямі вінаграднай лазы. Прыйдзе яго восемдзесят дзевятая вясна...

Слуцкі раён.

У КЛУБНАЙ «АКАДЭМІІ»

За піяніна — будучы кіраўнік духавога аркестра Сяргей Янукевіч.

Летась давялося мне быць у Шумілінскім раёне, у Мічурынскім сельскім клубе. Трапіў туды якраз у час рэпетыцыі клубнай агітбрыгады. Хлопцы і дзяўчаты чыталі сатырычныя вершы, спявалі песні і прыпеўкі. Анампаніравала ім на баяне загадчыца клуба Ніна Косцюшава.

Пасля рэпетыцыі мы разгаварыліся з ёй. Яна расказвала, як два гады назад вучылася на Рэспубліканскіх курсах па падрыхтоўцы кіраўнікоў калектываў мастацкай самадзейнасці.

— Ой, як спатрэбіліся мне тыя дзесяць месяцаў, — гаварыла Ніна. — Я і раней, да курсаў, тут клубам загадвала, але ж, дальбог, толькі «загадвала». Анічога рабіць не ўмела! Ні хору падыграць, ні плакат які намалявацы.. Можа будзеце калі на курсах, дык перадайце, калі ласка, педагогам прывітанне ад мяне і вялікі дзякуй!

... Такі выпадак сапраўды надарыўся. Некалькі дзён назад я наведаў у Зялёным Лузе Рэспубліканскія пастаянна дзеючыя курсы Міністэрства культуры БССР па падрыхтоўцы кіраўнікоў калектываў мастацкай самадзейнасці. Гутарачы з завучам Таццянай Левенштэйн, я ўспомніў сустрэчу з Нінай Косцюшавай, сказаў, што іх выпускніца памятае сваіх настаўнікаў і прасіла перадаць гарачае прывітанне і падзяку.

— Вельмі прыемна, — усміхнулася Таццяна Юльеўна. — Нашы выпускнікі не забываюць нас, пішуць, дзеляцца ў пісьмах сваімі радасцямі і засмучэннямі.

Таццяна Юльеўна дастала з шафы некалькі пачак пісьмаў:

— Вось, калі ласка, можаце пазнаёміцца.

Я гляджу на зваротныя адрасы—яны з усіх куткоў рэспублікі.

Чытаю пісьмо былога выхаванца курсаў Івана Барысюка. Цяпер ён кіруе калгасным хорам у Холмскім сельскім клубе Драгічынскага раёна. Хор вялікі — 130 чалавек. Барысюк просіць у пісьме прысласць яму новыя зборнікі песень, а заадно цікавіцца вучобай удзельніка хору Васіля Карпіка, які летась паехаў у Мінск на курсы.

Захацелася пагаварыць з Васілём...

Іду шырокімі калідорамі, зазіраю ў прасторныя і светлыя пакоі для рэпетыцый і заняткаў. Нарэшце-такі, курсы атрымалі цудоўны падарунак — вось гэты гмах, дзе ёсць усе ўмовы для падрыхтоўкі будучых кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці і клубных работнікаў.

— Вось як траба трымаць рукі, — гаворыць педагог А. В. Пікуцька Алене Шчоткінай, Ідуць заняткі па дырыжыраванню.

З-за дзвярэй рэпетыцыйнага пакоя чуваць гукі баяна. Тут я застаў Васіля Карпіка. Ён іграў і спяваў. У хлопца — добры барытон. Тры гады ён спяваў у калгасным хоры. Пасля заканчэння школы па рэкамендацыі кіраўніка хору І. Барысюка раённы аддзел культуры накіраваў Васіля на курсы. Цяпер ён паспяхова займаецца на дырыжорска-харавым аддзяленні.

Такіх, як Васіль Карпік, — былых удзельнікаў самадзейнасці—на курсах большасць. Ёсць сярод курсантаў, вядома, і больш вопытныя людзі, якія і раней працавалі культасветработнікамі.

...Старшыня курсавога савета Надзя Ляшчова. Летась, у дні юбілейнага фестывалю самадзейнага мастацтва, бачыў я яе на сцэне. Яна кіравала вядомым на Гомельшчыне Яромінскім хорам. А зараз дзяўчына старанна вучыцца на дырыжорска-харавым аддзяленні, рыхтуе з курсавым хорам песні.

Запомніўся яшчэ Вячаслаў Каралёнак, з якім я пазнаёміўся на ўроку анцёрскага майстэрства. Ён выконваў ролю пана Быкоўскага з купалаўскай «Паўлінкі». У выкананні яго ёсць шчырасць, непасрэднасць, пачуццё гумару. Пройдзе час, хлопец вернецца ў родную вёску Зялёнкі Мядзельскага раёна і стане кіраўніком драматычнага калектыву.

На рэпетыцыі танцавальнага аддзялення я яшчэ раз пераканаўся, як шмат трэба працаваць, колькі трэба «папацець» (і ў прамым сэнсе гэтага слова), каб развучыць толькі адзін танец. За дзесяць месяцаў слухачы курсаў павінны добра засвоіць шмат народных і сучасных танцаў, умець самастойна паставіць іх у танцавальных калектывах.

Аддзяленне духавых інструментаў на курсах параўнальна маладое, створана тры гады назад. Рыхтуе яно кіраўнікоў духавых аркестраў. Яны вывучаюць тэорыю музыкі, інструментоўку, вучацца дырыжорскаму майстэрству. А ўсе ведаюць, як патрэбны «духавікі» ў калгасных і саўгасных клубах, як іх там чакаюць.

Вывучаюць курсанты фотасправу, вучацца праводзіць тэматычныя вечары, вусныя часопісы, «агеньчыкі», афармляць клубныя памяшканні, ствараць наглядную агітацыю.

Дзесяць месяцаў — такі тэрмін навучання на курсах — праляціць хутка. Выпускнікі ўвальюцца ў армію культработнікаў.

Мы прызвычаіліся так гаварыць — армія культработнікаў. Але траба шчыра сказаць, што армія пакуль што малаватая...

Добра, вядома, што ёсць гэтыя рэспубліканскія курсы. Яны шмат робяць для папаўнення кадраў культработнікаў. Але...

Сцэна са спектакля «Людзі на балоце». У ролі Васіля — Вячаслаў Каралёнак, у ролі Ганны — Надзея Кароль.

Дырэктар курсаў Р. Ануліч гаворыць:

— Штогод мы рыхтуем прыкладна 200 кіраўнікоў самадзейных калектываў. Але ж гэта — кропля ў моры. На Украіне, напрыклад, амаль у кожнай вобласці ёсць такія курсы. Відаць, пара і нам падумаць над тым, каб мець у рэспубліцы шырокую сетку падобных курсаў і культасветвучылішчаў, урэшце — свой інстытут культуры.

В. КУЦЭНКА.

К. Г. Трыгубава і журналіст І. Каршакевіч у рэдакцыі.

ПОШУК ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Новае пра легендарную заслаўскую абарону

У АДЗІНАЦЦАТЫМ нумары «Літаратуры і мастацтва» за гэты год у нарысе І. Каршакевіча і М. Акаловіча «Стаялі насмерць» расказвалася пра пошук удзельнікаў абароны Заслаўля ў першыя дні Айчыннай вайны. Як вядома, тут 25—28 чэрвеня 1941 года група савецкіх байцоў вяла няроўны бой з фашысцкімі войскамі, што рваліся на ўсход. Два дні на шляху гітлераўцаў стаяла непераадольная сцяной група чырвонаармейцаў, стаяла, нягледзячы на тое, што фашысты пусцілі ў ход танкі, самалёты і артылерыю.

Аўтарам пошуку ўдалося высветліць, што галоўны ўдар фашыстаў пад Заслаўлем прынялі на сябе другая пагранічная застава 16 пагранатрада, якой камандаваў лейтэнант Міхаіл Трыгубаў, і ахове артылерыйскага склада, што размяшчаўся ў мястэчку. Падтрымалі іх адступіўшыя з захаду артылерысты адной з воінскіх часцей...

Які лёс напаткаў герояў абароны? Па некаторых звестках камандзір пагранічнікаў М. Трыгубаў загінуў смерцю храбрых у час з адной контратак. Загінула і многа яго таварышаў. А тыя, што засталіся ў жывых? Многія жыхары Заслаўля сцвярджаюць, што, калі стрымліваць шмат разоў большыя сілы праціўніка не было магчымасці, байцы ўзарвалі боепрыпасы, пагрузіліся ноччу ў машыны і рушылі ў напрамку Мінска...

Нядаўна ў рэдакцыю «Літаратуры і мастацтва» прыйшла жонка камандзіра пагранічнікаў Кацярына Георгіеўна Трыгубава. Пра многае з таго, што звязана з лёсам яе мужа, яна даведалася з газетнага нарыса. Праз рэдакцыю звязалася і з яго аўтарамі, якія, дарэчы, шукалі яе па ўсёй краіне — аказалася ж, што яна жыве побач, у Мінску...

— Тое, што адбылося пад Заслаўлем,—расказвае Кацярына Георгіеўна, — гэта частачка і майго жыцця, хоць у баях мне ўдзельнічаць не прывялося... Ды лепш— усё па парадку.

Калі пачалася вайна, мужу майму споўнілася дваццаць чатыры. За плячыма была вучоба ў Ленінградскім педінстытуце, потым у Каўказскім пагранічным вучылішчы — ён рашыў пайсці па слядах свайго бацькі, кадравага ваеннага. Там, на Каўказе, мы і пажаніліся.

Пасля вучылішча мужа паслалі служыць у Беларусь. Ну, пра жыццё на граніцы многа напісана, паўтараць няма патрэбы. Скажу толькі, што мы, жонкі, бачылі сваіх мужоў не вельмі часта — пастаянныя трывогі, камандзіроўкі, зборы і г. д.

Кажуць, што чалавечая памяць — вельмі ненадзейны інструмент, можа падвесці... Можа і так, але вось, бывае, закрыю вочы, і паўстае той час так ярка, так выразна, нібы было ўчора...

Вайна застала нас пад Заслаўлем, дзе муж быў камандзірам пагранічнай заставы. Вось кажуць, што вайна была поўнай нечаканасцю. Не для ўсіх, хаця, вядома, ніхто не прадбачыў, што ўсё так павернецца... Добра памятаю словы мужа — гэта было яшчэ вясной. Фашысты, гаварыў ён, відаць, збіраюцца з вайной на нас.

Як учора, памятаю, тое страшнае 22 чэрвеня. Чорнай хмарай ляцелі на ўсход самалёты са свастыкай. Выбухі бомб, зарава пажару...

З першай жа ночы, як пачалася вайна, муж увесь час быў на нагах. Як цяпер памятаю яго схуднелы, няголены твар, запалыя ад бяссоння вочы. Успамінаю яго таварышаў, іх стомленыя, устрывожаныя твары. І, разам з тым, была ў іх постацях рашучасць, упэўненасць — ні следу разгубленасці...

Міхаіл неяк сказаў мне, што застава рыхтуецца як след сустрэць фашыстаў — зброі і боепрыпасаў хапае. Тут жа ён прапанаваў мне эвакуіравацца і, калі я запярэчыла, сказаў:

— Каця, тут будзе вельмі горача, а ты...

Так, я збіралася стаць маці...

Раніцай 24 чэрвеня муж пасадзіў мяне з мамай, якая жыла з намі, на калёсы і адправіў у Заслаўль, дзе чакала машына. Ніколі не забуду гэтага апошняга нашага расстанку. Муж стаяў на ўзгорку і доўга, доўга махаў нам услед шапкай. Такім ён і застаўся ў маёй памяці...

Кацярына Георгіеўна ўсхвалявана змаўкае. Потым вымае з сумачкі некалькі фотакартак. Вось ён, Міхаіл Трыгубаў. Усмешлівы і зусім яшчэ юнацкі твар. На адной фатаграфіі ён на кані. «Нават памятаю мянушку каня, — сумна ўміхаецца жанчына, — Карлік. Міша вельмі любіў яго».

Мы цікавімся, як потым склаўся лёс Кацярыны Георгіеўны. Яна расказвае, як ішлі яны з маці на ўсход. Пра бамбёжкі, пра жах на дарогах, забітых бежанцамі... Жанчыны дабраліся да Оршы, а там селі на поезд. Рашылі ехаць да бацькоў Мішы, якія жылі на Паўднёвай граніцы. Там, на заставе, Кацярына Георгіеўна неўзабаве нарадзіла дачку.

— Яна ўжо скончыла ў мяне універсітэт, працуе, — з годдасцю гаворыць Кацярына Георгіеўна. — Вельмі, вельмі цікавіцца сваім бацькам, хоць ніколі яго не бачыла...

Адразу пасля вайны жонка камандзіра спецыяльна прыязджала ў Заслаўль, каб пабыць на месцы, дзе некалі была застава, дзе кіпеў гарачы бой... Ад заставы і знаку не засталося. Распытвала мясцовых жыхароў, але нічога пэўнага пра лёс мужа, пра лёс іншых пагранічнікаў сказаць яны не змаглі.

Кацярына Георгіеўна паказвае пісьмы з музея пагранічных войск ад былога начальніка Трыгубава—генерала А. А. Аляксеева, які, між іншым, піша, што паднята хадайніцтва аб пасмяротным узнагароджанні Міхаіла Трыгубава.

— Я вельмі ўдзячна, — кажа Кацярына Георгіеўна,—і газеце, і ўсім людзям, што заняты пошукамі ўдзельнікаў абароны Заслаўля. Я ўпэўнена, што пошук гэты ўвянчаецца поспехам.

М. ЗАМСКІ.

Гэты здымак быў зроблены перад самай вайной. М. Трыгубаў (злева) з таварышам.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

АД ГЕРОЯЎ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ДА ГЕРОЯЎ НАШЫХ ДЗЁН

У Віцебскім мастацкім салоне адкрыта абласная рэтраспектыўная выстаўка, прысвечаная юбілею Узброеных Сіл СССР.

Пра герояў грамадзянскай вайны, пра першых байцоў рэгулярнай Чырвонай Арміі расказвае палатно А. Толкача «Гэтых дзён не змоўкне слава!». Мастак шукае выразныя сілуэты, рашуча адыходзіць ад празаічнай трактоўкі тэмы, імкнецца да рамантычных абагульненняў.

А вось «запісныя кніжкі» мастакоў-франтавікоў—накіды і малюнкі, створаныя ў баях і паходах. Яны вабяць шчырасцю і непасрэднасцю занатаваных у іх уражанняў. Гранічна лаканічныя малюнкі А. Каржанеўскага «Пасля адыходу нямецкіх акупантаў у 1944 годзе», «Утаймаваны «тыгр», «Ля магілы героя». Прасякнуты глыбокім пачуццём работы І. Балтовіча «1941 год», «У дазоры», «Пераправа», «Вынас параненага», І. Бароўскага «У зямлянцы».

Трыпціх А. Арлова прысвечаны Вялікай Айчыннай. Часткі яго—«Разбураныя гарады», «Першы дзень міру», «Прысяга байцоў» сімвалізуюць еднасць у барацьбе воінаў і грамадзянскага насельніцтва. На жаль, жывапісцу пры ўсёй значнасці задумы не ўдалося дасягнуць арганічнага адзінства кампазіцыі.

Трэба адзначыць, што на выстаўцы наогул мала сур'ёзных тэматычных карцін. Трохі лепш з партрэтам. Але аўтараў, якія працуюць у гэтым жанры,—В. Кухарава, П. Явіча, А. Каржанеўскага—хацелася б засцерагчы ад аднастайнасці, выпадковасці ў выбары тыпажоў, павярхоўнасці характарыстык. Так, пры ўсёй знешняй завершанасці «Партрэт С. Ваедавода» П. Явіча або «Партрэт С. Собалева» А. Каржанеўскага недастаткова раскрываюць унутраны свет герояў. Больш глыбокае ўражанне пакідаюць «Партрэт медсястры» і «Партрэт Героя Савецкага Саюза Ф. Блахіна» В. Кухарава і «Партрэт М. Біруліна, камандзіра партызанскай брыгады» П. Явіча.

Невялікая карціна В. Кухарава «Дачка партызана», нягледзячы на выразны ідэйна-эмацыянальны «заряд», трохі «перасушана» і па жывапісу, і па кампазіцыі.

У Віцебску працуе шмат творчай моладзі. Работы маладых мастакоў Г. Шутава, В. Ральцэвіча, Я. Ясвіна, Ф. Гумена, Ж. Савіцкага, Я. Красоўскага, В. Лун'янава займаюць палавіну экспазіцыйнай плошчы выстаўкі.

Хочацца спыніцца на карціне Я. Ясвіна «Восень». Сюжэт яе вельмі просты: тры жанчыны ў полі рэжуць капусту.. Работа нечым суладная творам народнага дэкаратыўнага мастацтва. Лакальнасць колеру, звонкасць фарбаў, плаўнасць ліній надаюць ёй своеасаблівую песеннасць. Аднак у карціне няма глыбокага адухоўленых вобразаў. Разумовасць кампазіцыйна-стылістычных прыёмаў падаўляе непасрэднасць аўтарскага выказвання.

Сярод лепшых работ выстаўкі нельга не назваць «Трывогу» і «Цішыню» А. Толкача, «Ракеты» М. Міхайлава (жывапіс), акварэль Ф. Гумена «Вучэбны старт» (апошні паказаў таксама тры акварэльныя пейзажы, але яны мала што дадаюць да таго, што паказваў мастак у гэтай тэхніцы ранейш).

Поспехі і няўдачы выстаўкі павучальныя. Творчыя пошукі мастакоў стануць больш плённымі, калі мэтай іх будзе паглыбленне ў жыццё, пастаноўка значных ідэйна-творчых задач.

Барыс КРЭПАК.

МУЗЫКА—ЯГО СТЫХІЯ

М. ШНЕЙДЭРМАНУ — СЕМДЗЕСЯТ ГАДОЎ



Вось і яшчэ адно сямідзесяцігоддзе — на гэты раз дата ў біяграфіі мастака, які аддаў усё сваё жыццё развіццю нашай музычнай культуры. Я гавару пра тэмпераментнага і ўдумлівага майстра, пра Марка Эмануілавіча Шнейдэрмана. Ён з таго пакалення, чыё юнацтва супала з гадамі станаўлення ў нашай краіне Савецкай улады. І гэта ставіла яго аднагодкаў у рады першых будаўнікоў новай культуры, прасякнутай самай перадавой ідэалогіяй — камуністычнай.

Мне здаецца, што ўжо тое шырокае кола творчых інтарэсаў, у якім выяўляўся талент М. Э. Шнейдэрмана, сведчыць пра яго няўрымслівы характар — ён кампазітар і дырыжор, педагог і грамадскі дзеяч. Што ні робіць наш юбіляр, ён у любую справу ўносіць малады запал, дасведчанасць глыбока адукаванага музыканта, прынцыповасць грамадзяніна. Такім мы ведаем яго з першых крокаў на ніве мастацтва.

Нарадзіўся М. Шнейдэрман на сонечнай Украіне ў Жытоміры 5 сакавіка 1898 года. З маленства яго прывабіў свет музыкі. Жыў ён сярод людзей, для якіх песня была заўсёднай спадарожніцай — і ў радасці, і ў горы. Малады слых будучага кампазітара назаўсёды захаваў цудоўныя ўкраінскія народныя мелодыі. Выхоўваўся ён у Кіеўскай, а потым у Ленінградскай кансерваторыях. Педагогамі і духоўнымі настаўнікамі музыканта былі выдатныя дзеячы культуры — А. Глазуноў, М. Штэйнберг, А. Гаук, У. Шчарбачоў... Школай былі і тыя канцэрты віртуозаў, на якіх абавязкова бываў студэнт Марк Шнейдэрман, аўтарскія выкананні твораў, шумныя спрэчкі пасля філарманічных вечароў. Ён жыў тым напружаным і багатым музычным жыццём, якое і цяпер выклікае ў маладых пачуццё добрай зайздрасці: на канцэртныя падмосткі выходзілі тады першыя савецкія сімфанічныя творы, камерныя ансамблі, нараджалася новая опера, героем якой выступаў працоўны народ, ствараўся балет...

Нешта вельмі дарагое ўспрыняў М. Шнейдэрман, калі служыў у радах Рабоча Сялянскай Чырвонай Арміі. Амаль усе гады грамадзянскай вайны будуны кампазітар быў разам з людзьмі, чые подзвігі натхнялі нашых лепшых мастакоў. Нездарма ў яго так добра пісаліся маршы для духавога аркестра — меладычныя, імклівыя, строгія. Сапраўдная вайсковая музыка!

Значны след у музычнай культуры краіны пакінуў Шнейдэрман-дырыжор. Пад яго кіраўніцтвам лёгка і зладжана працаваў сімфанічны аркестр, і імя гэтага музыканта вялікай прафесіянальнай патрабавальнасці і арыгінальных трактовак у свой час называлася побач з імёнамі такіх талентаў, як М. Галаванаў, С. Самасуд, Н. Мелік-Пашаеў, Аскар Фрыд і Альберт Коутс. Ён іграў разам з выдатнымі салістамі — і для нас вельмі радасна, што яму давалі высокую ацэнку Д. Шастаковіч, Р. Глізэр і Д. Ойстрах. Я магу спасдацца на паспяховае выступленне Шнейдэрмана-дырыжора ў Карлавых Варах, дзе ўдумлівае мастацтва нашага калегі выклікала авацыю.

Мы з удзячнасцю можам гаварыць пра тое, як натхнёна выконваў гэты дырыжор творы беларускай музыкі. Тут ён быў не толькі таленавіты інтэрпрэтатар, але і добры дарадчык нашых кампазітараў. Буйныя падзеі ў музычным жыцці Беларусі звязаны з яго імем. Ён першы выконваў як дырыжор «Кветку шчасця» А. Туранкова, «Салаўя» М. Крошнера, Другую сімфонію П. Падкавырава і многія іншыя творы піянераў нацыянальнай прафесіянальнай музыкі. Ніколі не забуду пра нашу сумесную с Маркам Эмануілавічам працу над імім оперным першынцам — над сцэнічным увасабленнем «Міхася Падгорнага». Я да гэтага часу здзіўляюся, як дасканала вывучыў ён тады маю партытуру! У яго быў выпрацаваны свой погляд на трактоўку оперы, і музычную задуму ён здолеў раскрыць перад салістамі, аркестрам і хорам з захаваннем усіх аўтарскіх намераў. Не менш цікавай была і другая мая сустрэча з Маркам Эмануілавічам. Мы ў творчым кантакце з гэтым дырыжорам працавалі над операй «Алеся», якая была падрыхтавана для паказу ў вызваленай ад гітлераўцаў беларускай сталіцы «па гарачых слядах падзей», гаворачы словамі рэцэнзентаў. Скажу шчыра, яго густ, адчуванне стылявых асаблівасцей і ўсёй палітфаніі музычнага твора ўносяць у выкананне істотныя акцэнты і дапамагаюць данесці да слухача змест і ўсе нюансы.

Я назваў бы Шнейдэрмана-кампазітара майстрам малых інструментальных і вакальных форм. Сярод яго твораў — увертюры, п'есы для беларускага народнага аркестра, сюіта для двух фартэпіяна, санаціна, прэлюдыі і арыгінальныя апрацоўкі нацыянальных танцаў. Мне здаецца, што словы Дзмітрыя Шастаковіча пра юбіляра — «...Я даўно ведаю М. Э. Шнейдэрмана. Гэта — таленавіты дырыжор і разнабакова адукаваны культурны музыкант», — можна аднесці і да кампазітарскай творчасці Марка Эмануілавіча. Мабыць, слова культура больш за ўсё іншае стасуецца да яго самаадданага служэння мастацтву.

З 1939 года ён — на кафедрах опернай падрыхтоўкі студэнтаў і на дырыжорска-харавой у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Яго вучнямі былі многія выхаванцы гэтай навучальнай установы.

За плячыма ў М. Шнейдэрмана багацейшыя назіранні, пошукі, кантакты з выдатнымі музыкантамі, стварэнне сімфанічных праграм і оперных спектакляў... І ўсё гэта ён заўсёды гатоў аддаць дапытлівым калегам, сярод якіх ёсць і такія, што маглі б быць яго дзецьмі па ўзросту, але гэты ветэран ніколі не дэманструе перад імі сваёй перавагі.

У гэтых нататках я не мог прывесці ўсіх фактаў, вартых таго, каб іх прыгадалі ў дзень 70-годдзя Марка Эмануілавіча. Але абавязкова ўспомню водгук на яго працу над адной з першых савецкіх опер — «Паўночны вецер» Льва Кніпера, якую ставіў у 1934 годзе Маскоўскі тэатр-студыя У. Неміровіча-Данчанкі. Аўтар оперы адзначыў тады «выключна тонкую мастацкую работу» дырыжора М. Шнейдэрмана, работу «прасякнутую разуменнем партытуры і жаданнем ажыццявіць намеры кампазітара». Такім Марк Эмануілавіч сустракае і свой юбілей — культурным і выключна тонкім музычным дзеячом, які ўнёс у скарбніцу беларускай музыкі значны ўклад.

Я. ЦІКОЦКІ,
народны артыст СССР.

На блакітным экране

У ДРУГІМ ВЫМЯРЭННІ

ГЕРОІ «ТРЫВОЖНАГА ШЧАСЦЯ» ПАЧЫНАЮЦЬ ТЭЛЕВІЗІЙНАЕ ЖЫЦЦЕ

З ШАМЯКІНСКІМІ Пятром і Сашай мы даўно сталі добрымі прыяцелямі. Са спакойнай свабодай і празрыстай шчырасцю апавядаюць яны аб сваёй такой нялёгкай і такой шчаслівай дарозе, дарозе звычайных і далёка не простых «простых» людзей. Засяроджаныя, яны даюць поўную прастору сваім думкам «для сябе». Але ў арбіту «для сябе» аказваюцца ўцягнутымі і спадарожнікі, і сустрэчныя, і «папярэчныя». Гэта — гісторыя характараў у часе і прасторы.

І вось са старонак кнігі «Трывожнае шчасце» Пятро і Саша рушылі ў неспакойную тэлевізійную дарогу.

Дзве серыі спектакля «Трывожнае шчасце»— гэта толькі палова шляху. Мабыць, лепш было б пачакаць апошняй станцыі, а потым ужо — з лёгкім смуткам, што пройдзенага не вернеш, а зробленае не пераробіш нанава, — адзначыць, дзе яны, Саша і Пятро, крочылі цвёрда, дзе збочылі, а дзе далі вялікага кругу.

Але ж тое, што паказала Мінская студыя,— гэта ўжо факт.

Гледачы не засталіся абыякавымі да новай работы Мінскай студыі, пра што сведчыць пошта — водгукі паступаюць з усіх бакоў той прасторы, якую працінаюць хвалі нашага тэлецэнтра. Таму ўсё ж варта пагаварыць і пра першыя серыі спектакля. Падставы для гаворкі ёсць!

НАЎРАД ці прачытае кнігу столькі чытачоў нават у масавай бібліятэцы за год, колькі людзей паглядзела перадачы «Трывожнага шчасця». І гэта не толькі прапаганда літаратурнага твора. Мастацтва тэлебачання раскрывала і інтэрпрэціравала твор, эмацыянальна ўздзейнічала, пераконвала нас у тым, што перад намі героі, чыё жыццё вартае асэсавання і нават павучальнае.

У апошнія гады інсцэніроўка стала жанрам тэатральнай драматургіі. Тыя пласты рэчаіснасці і часу, што распрацоўвае эпас і лірыка, набываюць цікавыя сцэнічныя інтэрпрэтацыі. І нават недасканалыя інсцэніроўкі мастацкай прозы, якія грашаць ілюстрацыйнасцю, маюць даследчы зарад «чалавеказнаўства», што быў у рамане ці аповесці. Тым яны і цікавыя.

Пры ўвасабленні на экране літаратурных герояў звычайна гавораць—яны, маўляў, атрымалі другое жыццё,— маючы на ўвазе жыццё, а не яго паўтарэнне ў іншым увасабленні. Экранізацыя — гэта не ўцэненая літаратура, а самастойная творчасць. Ёй нельга абмяжоўвацца пераказам фабулы, яна абавязана пановаму перадаваць прозу, знаходзячы для яе часта па-метафарычнаму ёмістыя вобразы там, дзе першакрыніца была падрабязнай (замест аўтарскага аркуша — кадр або мантажны сказ!).

Мяне радуе, што на Мінскай студыі настойліва шукаюць арыгінальныя формы беларускага сапраўды тэлевізійнага спектакля, спецыфічныя прыцыпы пабудовы відовішча на «блакітным экране». Адзнакі творчых шуканняў у гэтым напрамку ёсць і ў «Трывожным шчасці», прынамсі, у тых двух серыях, пра якія я гавару.

Сцэнарый пастаноўкі належыць пяру аўтара рамана — Івану Шамякіну, які аб'яднаў свае намаганні з вопытным рэжысёрам Аляксандрам Гутковічам: яны разам стваралі літаратурны варыянт будучага спектакля, клапаціліся, каб захаваць сутнасць і дух рамана і, разам з тым, не занадта ж прытрымлівацца ўсіх яго фабульных перыпетый. Цяжкасць экранізацыі «Трывожнага шчасця» заключалася перш за ўсё ў пошуках агульнага ключа для напісаных у рознай манальнасці аповесцей, што складаюць тэтралогію. Лірычная «Непаўторная вясна», драматычныя «Начныя зарніцы» і, умоўна кажучы, вельмі «асабістыя» старонкі «Агню і снегу»—усе гэтыя змены атмасферы, настрою і нават прызмы твора пагражалі мастацка-жанраваму адзінству тэлеспектакля.

Наколькі аўтарам удалося дасягнуць мэты, скажу крыху ніжэй.

ЧАСОВА развіваючыся з героямі «Трывожнага шчасця» (наперадзе яшчэ, здаецца, тры серыі), шкадуеш, што яны страцілі даволі многа з той адметнай прывабнасці, якую мелі на старонках рамана. Мне асабіста здаецца, што неяк расплыўчата выглядае цяпер, на экране, працэс сталення Пятра, які толькі ледзь чутным намёкам прайшоў у спектаклі, што не пакідае таго моцнага ўражання па-чалавечы прыгожае прасвятленне Антаніны. Адналінейным на экране стала няўрымслівае праўдашукальніцтва ў Пясоцкага. Саша ледзе страціла арганічную цэльнасць натуры і набыла некаторую рытарычнасць. Па-асобку, мабыць, гэтыя страты і не кідаліся б у вочы, але разам узятыя яны ўжо сведчаць пра сур'ёзны пралік аўтараў інсцэніроўкі — згубіўся рух характараў герояў.

Тыя, хто не чытаў рамана (а такіх, мне здаецца, мала), магчыма, не заўважаць гэтага. Тыя ж з нас, хто палюбіў Пятра і Сашу з іх сябрамі ў кнізе, крыўдуюць, што першыя серыі тэлевізійнага спектакля не перадаюць аб'ёмнасці пачуццяў і думак, уласцівых гэтым вобразам у творы І. Шамякіна.

Справядліва зразумеўшы, што літаральнае следаванне сюжэтным падзеям не дасць карысці, аўтары сцэнарыя, на жаль, не былі паслядоўнымі ў пераасэнсаванні фабулы. Таму не толькі героі выглядаюць іншы раз «не такімі», а і асобныя сцэны існуюць на экране самі па сабе, без унутранай сувязі, чаргуюцца паводле знешняй логікі. Ланцуг быццам бы і атрымліваецца, але — не больш!

Як на прыклад безумоўнай удачы, спашлюся на эпізод з бомбай, што не разарвалася: тут матывіроўка ўчынку Пясоцкага аддадзена Кідалу. І добра атрымалася. Па-мастацку апраўданы акцэнт дапамог нібы «спраецыраваць» патрэбную фарбу для больш выразнага тлумачэння паводзін Кідалы, і гэтым эпізодам аўтары ўмела замянілі цэлыя старонкі падрабязных характарыстык персанажа ў рамане.

Затое ёсць у спектаклі і непатрэбнае ўдакладненне некаторых эпізодаў. Прыгадаю, напрыклад, сцэну провадаў мабілізаваных. Такой сцэны няма ў рамане. На старонках твора не было і сцэн дыверсіі юных партызан. Яны з'явіліся ў сцэнарыі, бо іх выклікала жаданне аўтараў даць рэпартажна-храналагічную паслядоўнасць падзей. На экране эпізод провадаў мабілізаваных эмацыянальна невыразны і супярэчыць драматызму наступнай сцэны. Дыверсія ж, знятая з наўмыснай эфектнасцю, не мае ніякай сэнсавай нагрузкі, гэта яшчэ адна ўмоўная ілюстрацыя да тэмы партызанскай барацьбы юных мсціўцаў.

Часта А. Гутковіч па-рэжысёрску занадта доўга «рыхтуе» гледачоў да вузлавых сцэн-падзей, зацягвае экспазіцыі. Таму гэтыя вузлавыя моманты сюжэта набываюць фрагментарны характар. Хацелася б разгледзець вочы герояў, услухацца ў голас іх сумлення, але рэжысёр спяшаецца, бо ўсе надзеі на мастацкі эфект ён усклаў на экспазіцыю да сцэны-падзеі. Гэта, на маю думку, перашкаджае знайсці экранны эквівалент рамана і больш нагадвае стэму ілюстрацый. У тэлеспектаклі пакуль што склаўся сімбіёз вобразнага і ілюстрацыйнага. Другое пераважае... Магчыма, гэта тлумачыцца жаданнем часцей прытрымлівацца таго, што — у тэксце рамана.

ПЕРШАЯ ЗАДАЧА акцёра, які іграе ў экранізацыі прозы,— пераканаць гледача, што герой быў і павінен быць такі, якім яго паказваюць вось зараз на «блакітным экране». Можа, і не зусім такі, але вельмі падобны да таго, што ў рамане.

Саша, Пятро, Лялькевіч — быццам банальны «трохкутнік». Але такое ўражанне—павярхоўнае. Раманіст па-свойму вырашае традыцыйнае, бо дае ўзаемаадносіны людзей у асвятленні іх характараў полымем суровага часу. У рамане героі неад'емна ад часу. І праз іх характары, якія гартуюцца, фарміруюцца пад уздзеяннем падзей, разумеещ час.

Я ўжо гаварыў, што страціла Саша ў сцэнарыі. На жаль, і ў спектаклі М. Захарэвіч не ўдалося стаць бліжэй да першакрыніцы. Светлае і радаснае адчуванне Сашай неабходнасці (я б сказаў, жыццёвай неабходнасці) стаць шчаслівым чалавекам раздзелены актрысай на асобныя, не звязаныя ў характар настроі, амаль аднолькавыя па стану ў розныя моманты жыцця гераіні. Недзе прарвецца сардэчная шчырасць і адразу завяне. Мабыць, тут прычына і ў тым механічным расчляненні мовы і паводзін Сашы на экране, якія робіцна рэжысёрам і аператарам у эмацыянальна-ўзрыўных сцэнах. Асобныя — і дастаткова важныя — эпізоды чамусьці вырашаны мімаходам.

А чаму ў Сашы аднастайны — ці то незадаволены, ці то пакутлівы — выраз твару? Нават тады, калі яна дае сваім чулым сэрцам ацэнку розным падзеям. Да таго ж «маладая» Саша ў пачатку спектакля выглядае значна старэйшай за пасталелую ў далейшым. І раптам нібыта другі чалавек перад намі — знешне і ўнутрана — у эпізодзе, калі Саша едзе з Лялькевічам у горад.

Амаль тое ж можна сказаць пра Г. Гарбука—Пятра. Яго ўчынкі нейкія разарваныя, не звязаныя з дзеяннем; ствараецца ўражанне, быццам гэты герой назірае збоку за падзеямі. Праўда, асобныя сцэны ў выкананні Г. Гарбука радуюць нават і ў гэтай манеры ігры. Прыгадаю эпізоды, калі Пятро размаўляе з Лялькевічам або вядзе «гутарку» з Кідалам. Аднак з асобных сцэн характар яшчэ не складваецца. Нібы артыст яшчэ прыглядаецца да героя і абяцае «разыграцца». Застаецца спадзявацца на працяг сустрэчы і нашу больш блізкае знаёмства з такім Пятром.

Разарваная нітачка характараў Пятра і Сашы рассыпала перад намі асобныя пацеркі — калі бліскучыя, калі крыху цьмяныя. Мазаікай уражанняў яны пакуль і застаюцца ў памяці.

Лялькевіч у М. Яроменкі—вытрыманы чалавек; разважліва хавае ён свае пачуцці і толькі зрэдку адкрывае душу. Пэўную сухасць гэтай натуры можна вытлумачыць «матэматычным» складам мыслення. Трохі перашкаджае цэльнасці характару халодная назіральнасць і неверагодная раптоўнасць рэакцый—вось Лялькевіч—Яроменка загарэўся, а вось і астыў. Мяне ўразіла сцэна пакутлівага «вяселля», але хацелася б, каб глядач тут зразумеў, што Лялькевічу балюча ад сур'ёзнай раны і ад усяго гэтага небяспечнага вясельнага абраду.

Пясоцкі — Ул. Рагаўцоў актыўны ў сваім разуменні дабра і зла, сумленны перш за ўсё перад самім сабой. Акцёр паказвае яго змагаром за праўду, поўным светлых думак і пачуццяў. Але і ён пакуль што аднастайны ў сваіх сцвярджэннях праўды: па-акцёрску роль іграецца правільна, але яе можна ўзбагаціць нюансамі.

У нечым яны падобныя, Пясоцкі—Рагаўцоў і Даня—Турмовіч,— юначай танклявасцю, пасадкай галавы, пільнымі і насцярожанымі вачыма, абрысамі твару... А хутчэй — патрабавальнасцю да сябе і навакольных, усведамленнем свайго месца і ролі не толькі розумам, а і сэрцам таксама. Даня—В. Турмовіч яшчэ захоўвае дзіцячую шчырасць, ён захоплены барацьбой, як гульнёй. Але і ў гэтым ужо ўгадваецца неспакойная цвёрдасць перакананняў. А яго маці Поля — Г. Макарава запамінаецца насцярожаным неспакоем, нейкім глыбока асабістым разуменнем неабходнасці барацьбы.

Больш складаныя адносіны да Кідалы — Б. Уладамірскага, антипода Пятра і Сені Пясоцкага. Кідала адразу зразумелы, а акцёр яшчэ больш згушчае фарбы: мімікай, павадкай зноў і зноў імкнецца падкрэсліць, што за непрыемная асоба яго Кідала. Нават у адносінах да Антаніны, якая яму падабаецца.

Калі ў дачыненні да ўсіх герояў спектакля можна гаварыць аб большым ці меншым супадзенні акцёрскіх работ з літаратурнымі прататыпамі, дык вобраз Антаніны ўвогуле супярэчыць гэтаму персанажу ў рамане. Справа не толькі ў тым, што Антаніна ў выкананні Г. Талкачовай загадзя ўпэўнена ў сваёй перамозе над Пятром і не адчапілася ад яго да апошняга свайго з'яўлення: тут слізгае па паверхні пачуцця гэткае пагоршанае выданне «вамп». Яе вобраз трэба было або зусім выкрэсліваць са сцэнарыя, або раскрываць адпаведна раману. Тады б не страціла яна чалавечую жывінку, душэўную своеасаблівасць, інакш быў бы асветлены яе характар. Зараз гэты персанаж не звязаны са «звышзадачай» спектакля.

ЛІТАРАТУРНАЯ крытыка даволі ўмоўна, але падзяляе эпічныя творы прозы на «рамачы падзей» і «раманы характараў». У дачыненні да «Трывожнага шчасця» такі падзел выглядае нават справядлівым, бо сярод аповесцей можна вылучыць, як я ўжо гаварыў, і гранічна спавядальныя, і вострасюжэтныя. Дык вось на «блакітным экране» захаваліся асноўныя займальныя сітуацыі і сутычкі з «рамана падзей», а тое, што складала змест і дух «рамана характараў» перайшло ў зацягнутыя экспазіцыі да ключавых фабульных вузлоў. Мне здаецца, гэта і акцёраў прымусіла іграць не так, як яны звычайна іграюць: у эпізодах вострых канфліктаў яны не вельмі клапоцяцца, каб нешта такое глыбіннае раскрыць у героях, бо рэжысёр і аператар, на іх думку, самі ўсё «зробяць на экране»—дадуць дзе трэба буйныя планы, мантажныя перабіўкі, падкрэсляць дынаміку мізансцэн і г. д. Таму, відаць, на працягу двух серый «Трывожнага шчасця» мы пакуль што лепш «прачыталі» старонкі «рамана падзей», а ў «рамане характараў» пераважна ўбачылі акцёрскія спробы паказаць псіхалагічныя рэакцыі на тое, што адбываецца навокал, або на тое, што прадстаіць зрабіць іх героям. Там, дзе раманіст адводзіў на лірычныя споведзі ці на аўтарскія адступленні старонкі і цэлыя главы, у тэлеспектаклі — скажу гэта яшчэ раз — мільгае кадр, ну, у лепшым выпадку, «мантажны сказ» на адну мінуту, а то і менш. Выходзіць, чытачам спектакля, вядома, прыгадае нешта з кніжных старонак, а «чыстаму» гледачу будзе ўвесь час здавацца, што Мінская студыя экранізавала «раман падзей».

Я не збіраюся даваць рэцэпты, як рабіць інсцэніроўкі, але мушу параіць аўтарам спектакля «Трывожнае шчасце» ў наступных серыях больш рашуча адыходзіць ад літаральнасці, ад знешняй паслядоўнасці, а шукаць сапраўды вобразны эквівалент старонкам прозы на мове ўласнага мастацтва—тэлебачання. Яна ж, відаць, ёсць, гэтая мова!

Алег САННІКАЎ.

БЕЛАРУСЬ—ПРЫБАЛТЫКА

З паездкі ў Прыбалтыку вярнуўся народны ансамбль танца Палаца культуры прафсаюзаў — «Вясёлка». Ён прымаў удзел у семінары-практыкуме па народнаму танцу, які арганізаваў Рэспубліканскі палац культуры прафсаюзаў Літвы і таварыства народнага мастацтва ў Вільнюсе.

Два дні кіраўнікі і ўдзельнікі ўзорнага танцавальнага калектыву «Вайва», танцавальных калектываў «Папрадухі» з Эстоніі, «Ліга» з Латвіі і беларускія танцоры развучвалі эстонскія, латышскія, літоўскія і беларускія народныя танцы. У выніку кожны калектыў узбагаціў свой рэпертуар.

Сустрэча завяршылася вялікім «Канцэртам дружбы».

В. БАРЫСЕВІЧ.

Самадзейны цырковы калектыў Гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў з поспехам выступае ў гарадах і вёсках вобласці. Гомельскія артысты —пераможцы рэспубліканскага агляду і лаўрэат Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва.

На гэтым здымку вы бачыце выступленне акрабатаў Галіны Аўрамчыкавай і Рыгора Капейкіна.

Фота Ч. МЕЗІНА (БЕЛТА).

СЯРОД КНІГ

ПАШПАРТ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

У апошнія гады малавядомая раней галіна мовазнаўства — тапаніміка — стала вядома як навука шырокаму колу нашай грамадскасці. Аб ёй шмат гавораць і пішуць.

Новая праца В. Жучкевіча «Тапаніміка Беларусі», якая нядаўна выйшла ў свет у выдавецтве «Навука і тэхніка», — багатае навуковае даследаванне пра геаграфічныя назвы нашай рэспублікі. Аўтар сістэматызаваў і прааналізаваў усе беларускія геаграфічныя назвы. Яны разглядаюцца ў сувязі з дадзенымі гісторыі, археалогіі, фальклору, этнаграфіі і геаграфіі, у святле навейшых здабыткаў гэтых сумежных навук. У кнізе даецца кароткая лінгвістычная характарыстыка назваў па моўнай прыналежнасці, граматычных формах і фармантах.

Аўтар асабліва падкрэслівае, што тапаніміка стаіць на мяжы трох навук — лінгвістыкі, гісторыі і геаграфіі. Дакладнасць фактаў гэтых навук дае магчымасць зрабіць сур'ёзныя тэарэтычныя вывады. Аўтар станоўча адносіцца да вывучэння мясцовых назваў у рэгіянальным плане, што з'яўляецца надзейнай першаасновай для далейшых пошукаў і навуковых даследаванняў.

В. Жучкевіч, апрацоўваючы назвы, зрабіў іх статыстычны, фармантны і семантычны аналіз, шмат месца адвёў асаблівасцям тапанімічнай лексікі. Назвы разглядаюцца ў дыялектычным адзінстве з рознымі зменамі ў гаспадарчай дзейнасці, якая выклікала да жыцця характэрныя для пэўнага перыяду найменні.

Вядома, што тэрыторыя Беларусі спрадвеку была заселена славянамі, якія аказвалі ўплыў на сваіх суседзяў. Апошняе выяўляецца ў лексіцы, агульнай як для беларускай мовы, так і для моў суседніх народаў. Адначасова быў і працягваецца адваротны ўплыў мовы суседзяў на беларускую мову. В. Жучкевіч схільны лічыць, што ў беларускай мове ёсць значная колькасць літуанізмаў і балтызмаў. Думаецца, аднак, што тут аўтар перабольшвае. У яго пералік трапілі як спрадвечна літоўскія словы, так і словы, якія з'яўляюцца агульнымі для літоўскай, беларускай, польскай, нямецкай моў і ўзыходзяць да індаеўрапейскага кораня. Агульнасць слоў яшчэ не гаворыць аб іх запазычанні.

Аўтар правільна адзначае багацце славянскай тэрміналогіі і назваў на Беларусі. Ён упершыню сістэматызуе па значэнню ўсе тэрміны, якія адлюстраваліся ў мясцовых назвах. Кожная група ілюструецца багатай беларускай тэрміналогіяй, раскрываецца яе значэнне, ужыванне. Шкада толькі, што тэрміны падаюцца ў рускай транскрыпцыі і часам цяжка меркаваць аб сапраўдным мясцовым альбо агульнабеларускім іх гучанні.

Аўтару ўдалося сабраць цікавую па семантыцы частку гідраграфічных, ландшафтных і іншых тэрмінаў. Сувязь тапанімікі з антрапанімікай таксама не засталася па-за ўвагай даследчыка. Даюцца характэрныя фарманты ў беларускай тапаніміі ад прозвішчаў.

У раздзеле «Назвы рэк» аўтар прытрымліваецца слушнай думкі, што вялікія рэкі захавалі свае больш старыя назвы. Малыя ж рэкі часцей атрымлівалі новыя назвы. Але ёсць і адступленні. Бывае, што малыя рэкі і вадасховішчы захоўваюць вельмі старыя назвы. Так, сучасная рэчка Пяшчанка даўжынёй каля 20 кіламетраў у Слаўгарадскім раёне ўпершыню ўпамінаецца ў летапісе пад 984 годам як Пішчань, Пішчана; азёры Іўнае, Пеннае значацца ў чыншавым інвентары за 1681 год як Іўне, Пенна.

У нашай літаратуры назіраецца, як нам здаецца, залішняя даверлівасць да чужаземных даследаванняў, калі наша лексіка лёгка аддаецца ці адносіцца без асаблівых падстаў да балтыйскай і іншых без уліку і аналізу мясцовага вымаўлення тых альбо іншых назваў, а таксама іхняга дублетна-сінанімічнага раду. Так, назвы ракі Арэса і пасёлка Грэск залічваюцца ў назвы балтыйскага паходжання. Але нідзе і нікім не ўказваецца, што на месцы, тутэйшыя людзі называюць Арэсу Расой. Зусім магчыма, што апошняя назва ёсць наіўнае пераасэнсаванне першай, але не пазбаўлена слушнасці і адваротная думка, што назва Раса — старажытная славянская назва. Таму важна прасачыць дынаміку рачных назваў па атласу Занноні, па радзівілаўскіх картах і розных чыншавых інвентарах, дзе ёсць шмат рознапачытанняў і варыянтаў, якія могуць дапамагчы даследчыку выявіць першасную назву. Можа сапраўды выявіцца, што рака мела балтыйскую назву толькі на пэўным адрэзку. У гэтым кірунку В. Жучкевіч зрабіў шмат. Ён прапанаваў новы ў гідраніміі метад квадратаў для вызначэння тапанімічных раёнаў.

У раздзеле пра азёры аўтар справядліва адзначае, што азёрныя назвы Беларусі пакуль што вывучаны слаба. Азёры мелі значна меншае значэнне ў жыцці чалавека, чым рэкі, а таму і назвы іх былі вядомы толькі мясцовым людзям і слаба замацоўваліся ў навакольным тапанімічным ландшафце. Толькі ў азёрных краях — на Полаччыне і Браслаўшчыне — азёры ў старажытнасці мелі, відаць, большае гаспадарчае, а часам нават абарончае значэнне. Таму, напрыклад, на Красенскім возеры, што на Дзісеншчыне, адзначаецца штучная падводная дарога.

Надзвычай багатым і цікавым з'яўляецца раздзел кнігі пра назвы населеных пунктаў. Гэта сапраўды самая шматлікая і найбольш разнастайная частка тапанімікі з элементамі старажытнай і новай гісторыі. Усе назвы аўтар разглядае ў плане фармантным і сэнсавым. Раздзел багата ілюстраваны картамі-схемамі, што робіць матэрыял наглядным і даступным. Усе назвы населеных пунктаў разглядаюцца пераважна ў сінхронным плане. Такі аналіз таксама вельмі неабходны і карысны.

Трэба мець на ўвазе, што афіцыйная назва населенага пункта на месцы мае варыянты, а таксама яшчэ некалькі назваў неафіцыйных. Апрача таго, часам адна афіцыйная назва аб'ядноўвае некалькі гістарычна розных вёсак, якія цяпер зліліся ў адну. Бывае, што населены пункт знік, а яго назва захавалася як назва ўрочышча. Толькі гістарычная геаграфія дасць магчымасць не пераносіць сучасных уяўленняў і меркаванняў у старажытнасць. Толькі яна ўскрые дынаміку развіцця назваў, пакажа іх аб'ектыўныя заканамернасці ў сэнсавым і фармантным планах. Так, напрыклад, не ўсе, відаць, назвы са старажытным фармантам -ня сведчаць пра вытворчасць і вытворчую дзейнасць. Назва вёскі Трубільня ў Слаўгарадскім раёне паходзіць хутчэй ад мясцовага геаграфічнага тэрміна труба — упадзіна між узгоркаў, рэчышча ракі.

Новым і цікавым у кнізе В. Жучкевіча з'яўляецца і тое, што аўтар вылучае на аснове словаўтваральных мадэляў тапанімічныя раёны і месцы наяўнасці архаічных славянскіх і літоўскіх назваў, рачных суфіксаў і інш.

Правільнай этымалогіяй аўтар лічыць тую, якая спалучае ў сабе лінгвістычныя метады з дадзенымі гісторыі і геаграфіі. Не адкідваючы меркавання даследчыка аб тым, што назва горада — Лоеў — першапачаткова абазначала прыстань і месца, дзе вырабляліся лодкі (лоив, лоива), усё ж можна меркаваць што яна мае відаць патранімічнае паходжанне. Так, на картах сярэдневяковай Беларусі на месцы сучаснага Лоева мы сустракаем населены пункт Лоевагара (1595). Вядома таксама, што ёсць імя Лой, прозвішчы Лойка, Лоя і інш. Патрабуецца больш дэталёвае даследаванне гэтай назвы. Відаць, патранімічнае паходжанне мае і назва Доўск, бо на старых картах ён значыцца як Досков, а ў мясцовым вымаўленні — Удоўск.

У канцы кнігі падаецца слоўнік (каля 800 назваў). У ім зафіксаваны вядомыя, але загадкавыя геаграфічныя назвы Беларусі. Аўтар выказвае свае меркаванні пра іх паходжанне, падаючы шэраг новых і цікавых гіпотэз. Цікава і, думаецца, слушна тлумачыць ён паходжанне назваў гарадоў Гомеля, Крычава і г. д. Аднак, на мой погляд, ён залішне шмат назваў лічыць балтыйскімі па паходжанню. Мы перакананы, што шырокае азнаямленне вучоных у будучым з розным беларускім тапанімічным матэрыялам зменіць малюнак у нашай тапанімічнай геаграфіі.

У кнізе В. Жукевіча даецца многа карысных парад для практычнага выкарыстання тапанімікі ў навуковых даследаваннях.

І. ЯШКІН.

В. Жучкевіч. «Тапаніміка Беларусі». На рускай мове. Выдавецтва «Навука і тэхніка». Мінск, 1968.

ПРАЦА МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ

«Праблемы сучаснага беларускага мастацтва» — так называецца зборнік, падрыхтаваны калектывам маладых вучоных Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Ён выйшаў у выдавецтве «Навука і тэхніка».

У кнізе ўзнімаецца шмат пытанняў. Значнае месца займаюць матэрыялы, прысвечаныя кіно. Кіназнаўцы В. Нячай, Г. Падбярэзскі, Г. Ратнікаў, разглядаючы мастацкае адлюстраванне жыцця ў беларускай кінематаграфіі, спыняюцца на праблемах драматычнага канфлікту, прасочваюць этапы развіцця вобраза сучасніка ў дакументальных кінастужках. У. Халіп прысвяціў свой артыкул разгляду прынцыпаў экранізацыі літаратурных твораў. На матэрыяле савецкай класікі ў беларускіх тэатрах Т. Арлова паказвае, як трансфармуецца акцёрам матэрыял драматычнага твора.

У зборніку змешчаны таксама артыкулы аб працы мастака па афармленню спектакля, аб некаторых асаблівасцях мастацкага афармлення беларускіх кніг і шэраг іншых матэрыялаў.

ДРУК БЕЛАРУСІ

Кніжная палата БССР выпусціла ў свет цікавы статыстычны зборнік «Друк Беларускай ССР». У ім змешчаны матэрыялы аб выданні кніг, часопісаў і газет у Беларусі, звесткі аб перакладах кніг з моваў народаў СССР і зарубежных краін на беларускую, аб выданні твораў класікаў марксізма-ленінізма, беларускіх пісьменнікаў, кніг па розных галінах ведаў.

36 статыстычных табліц, распрацаваных калектывам Кніжнай палаты, раскрываюць адну з старонак ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі ў Беларусі, культурнай рэвалюцыі, ажыццёўленай у нашай краіне пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі.

Варта прывесці толькі дзве лічбы. З 1918 па 1966 гады ў рэспубліцы выдадзена 37.909 назваў кніг і брашур агульным тыражом 436,5 мільёнаў экземпляраў. Па колькасці выдадзеных кніг і тыражах Беларусь заняла чацвёртае месца сярод саюзных рэспублік.

Табліцы сведчаць, што з года ў год у рэспубліцы не толькі расце колькасць выпушчанай літаратуры, а і пашыраецца яе «асартымент»; мяняецца профіль, што адлюстроўвае вялікія зрухі, якія адбываюцца ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, навуцы і культуры.

Шырока распрацаваны ў даведніку статыстычныя матэрыялы пра выпуск мастацкай, палітычнай, навуковай літаратуры, кніг для дзяцей і г. д.

Але пажадана было б, каб метадычныя прынцыпы, пакладзеныя ў распрацоўку статыстычных матэрыялаў, аўтары зрабілі вядомымі чытачу. Інакш узнікаюць многія пытанні.

На наш погляд, напрыклад, складальнікі недастаткова патрабавальна аднесліся да асобных параўнанняў. Так, жадаючы падкрэсліць рост кнігавыдавецкай справы ў рэспубліцы, яны міжволі зменшылі нашы дасягненні ў апошнія перадваенныя гады. У даведніку гаворыцца, у прыватнасці, што ў 1940 годзе ў Беларусі на душу насельніцтва прыходзілася 1,1 кнігі, а ў 1965 годзе—каля 3 кніг. У сапраўднасці ж з 1930 па 1939 гады сярэдняя лічба была большая. (прыкладна, каля 2 кніг, а былі гады, калі і па 2 кнігі на душу насельніцтва).

У 1939 годзе, пасля ўз'яднання з заходнімі абласцямі насельніцтва і тэрыторыя рэспублікі выраслі амаль удвая. Адразу ж пачалася гіганцкая работа па эканамічнаму і культурнаму ўздыму заходніх абласцей. Вось чаму для характарыстыкі даваеннага ўзроўню кнігавыдавецкай справы ў Беларусі дадзеныя толькі па аднаму 1940 году не паказальныя.

Не зусім, на наш погляд, звязаны са зместам зборніка ўступны артыкул А. Раковіча.

Выклікае здзіўленне «неаператыўнасць» выдання. Амаль адначасова з нашым зборнікам Усесаюзная кніжная палата выдала статыстычныя нарысы «Друк СССР за 50 гадоў». Калі ў беларускі даведнік увайшлі дадзеныя толькі па 1965 год, дык у маскоўскім зборніку Беларусь прадстаўлена па 1966 год уключна.

С. АШАРОВІЧ.

«Друк Беларускай ССР (1918—1965 гг.)». Статыстычныя матэрыялы (да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка). Складальнікі Л. Даманоўская і Л. Рабушка. Кніжная палата БССР, Мінск, 1967 г.

КРЫТЫК, ПРАЗАІК, ПЕРАКЛАДЧЫК

ЯНКУ ШАРАХОЎСКАМУ — ШЭСЦЬДЗЕСЯТ ГАДОЎ

У сувязі з 60-годдзем Янкі Шарахоўскага праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Іван Захаравіч! Сардэчна вітаем і віншуем Вас, нашага таварыша па літаратурнай працы, з 60-годдзем з дня нараджэння.

Вы прыйшлі ў літаратуру ў пачатку трыццатых гадоў як крытык і літаратуразнаўца. Вашы артыкулы па надзённых пытаннях развіцця беларускай літаратуры, крытычна-біяграфічныя нарысы пра асобных пісьменнікаў, даследаванні творчасці Янкі Купалы адзначаны яснасцю ідэйных пазіцый, удумлівым, клапатлівым падыходам да спадчыны і нашых сучасных здабыткаў. Не без поспеху выступілі Вы і ў жанры мастацкай прозы, выдаўшы зборнікі апавяданняў «Срэбная раніца» і «Сердалікавая бухта», а таксама як перакладчык асобных твораў класікаў рускай і ўкраінскай літаратур.

Значны час у пасляваенныя гады Вы працавалі адказным сакратаром часопіса «Полымя», а затым — галоўным рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР, прымаючы непасрэдны ўдзел у арганізацыі літаратурнага працэсу і выхаванні маладых пісьменнікаў.

Мы высока цэнім і сённяшнюю Вашу дзейнасць на пасадзе дырэктара аднаго з нашых любімых культурных асяродкаў — літаратурнага музея Янкі Купалы.

Ад усёй душы жадаем Вам, дарагі Іван Захаравіч, здароўя, доўгіх гадоў жыцця, добрага творчага настрою».

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага цёплага віншавання і шчырых пажаданняў.

Літаратурная грамадскасць рэспублікі ведае Янку Шарахоўскага ў першую чаргу як крытыка, як аўтара сур'ёзных прац аб творчасці Я. Купалы, Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, В. Таўлая, П. Пестрака, як аўтара даследавання някрасаўскіх традыцый у беларускай літаратуры, шматлікіх рэцэнзій і артыкулаў. Вучань вядомых савецкіх вучоных літаратуразнаўцаў Я. Карскага, Б. Эйхенбаўма, Б. Тамашэўскага, В. Дзясніцкага-Строева, К. Пушкарэвіча, выхаванец Ленінградскага гісторыка-лінгвістычнага інстытута, Я. Шарахоўскі валодае лепшымі якасцямі літаратурнага крытыка і даследчыка. Ён умее тонка разбірацца ў літаратурных з'явах і фактах, супастаўляць і абагульняць іх, гаварыць пра іх ясна і даходліва, умее пераканаўча давесці да чытача свае палажэнні і сцвярджэнні.

Нядаўна юбіляр закончыў працу над навуковай біяграфіяй народнага песняра Беларусі Янкі Купалы, у якой літаратурная і грамадская дзейнасць выдатнага паэта асветлена найбольш поўна, на багатым фактычным матэрыяле і ў сувязі з развіццём усёй беларускай літаратуры. Напісаць гэтую работу Я. Шарахоўскаму памагла, трэба меркаваць, яго шматгадовая праца на пасадзе дырэктара літаратурнага музея Янкі Купалы. Я. Шарахоўскі здолеў наладзіць у музеі навукова-даследчую работу па збіранню і сістэматызацыі купалаўскай бібліяграфіі, апрацоўцы фондавых матэрыялаў, па ўдакладненню і высвятленню невядомых фактаў з біяграфіі песняра.

Ведаем мы юбіляра і як празаіка. У 1951 годзе выйшаў у свет зборнік яго апавяданняў «Срэбраная раніца», а ў 1955 годзе — кніжка апавяданняў для дзяцей «Сердалікавая бухта». Цяпер Янка Шарахоўскі працуе над дакументальнай аповесцю — пра баявую дзейнасць у час Вялікай Айчыннай вайны партызанскай брыгады, якой камандаваў Васіль Сяргеевіч Лявонаў.

Сістэматычна займаецца Янка Шарахоўскі і перакладамі. Гэта дзякуючы яму мы маем на роднай мове раманы «Рудзін» і «Напярэдадні» І. Тургенева, «Казкі» М. Салтыкова-Шчадрына, «Сляпога музыку» Ул. Караленкі, «Аповесць пра дзяцінства» Ф. Гладкова, зборнік апавяданняў І. Франка і многія іншыя творы.

З такім багажом прыйшоў Янка Шарахоўскі да свайго юбілею. Думаецца, што багаж гэты не малы.

У дзень шасцідзесяцігоддзя мне ад душы хочацца пажадаць Івану Захаравічу доўгіх гадоў жыцця, добрага здароўя і новых творчых поспехаў на ніве роднай літаратуры і культуры.

А. ЕСАКОЎ.

Малюнкі мастака М. Бельскага да кнігі І. Гурскага «На берагах Нявы», якая выходзіць у выдавецтве «Беларусь».

ЛЕТАПІС

СТАНЦЫІ БАРАНАВІЧЫ

У канцы 80-х гадоў Леў Мікалаевіч Талстой пабываў праездам на станцыі Баранавічы. Позна вечарам пісьменнік вырашыў прагуляцца перад сном. Выйшаў на перон, пахадзіў вакол станцыі. Апрануты ён быў па-сялянску, і жандар не пусціў яго назад у вагон. Пісьменнік абурыўся і пакінуў скаргу ў журнале. Аўтограф пісьменніка захоўваўся на станцыі і загінуў разам з іншымі дакументамі ў час фашысцкай акупацыі.

У 1932 годзе ў Баранавічах пабываў яшчэ адзін Талстой — Аляксей Мікалаевіч. У сваіх дарожных нарысах ён пісаў:

«О-о, горад, якім ты быў гадоў 20 назад, з драўлянымі хаткамі, бруднымі вуліцамі, з вялікай колькасцю касцёлаў на відных месцах, такім стаіш ты і цяпер... Прагрымелі вялікія гады, а тут усё стаіць, як стаяла...»

Гэта толькі асобныя эпізоды з матэрыялаў «Гісторыі станцыі Баранавічы», якія сабраў стары член партыі, удзельнік штурму Зімняга, персанальны пенсіянер Дзмітрый Анісімавіч Жукавец. Дзмітрый Анісімавіч больш за дваццаць гадоў працаваў на Баранавіцкай дыстанцыі дарогі. У брашуры, якую ён падрыхтаваў да друку, расказана аб зменах, што адбыліся на станцыі і ў горадзе за гады Савецкай улады.

М. ДАНОВІЧ.

З ЛІТАРАТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Аркадзь Чарнышэвіч

У ДАРОЗЕ

ПАЭМА

Вершы Аркадзя Чарнышэвіча? Як быццам крыху дзіўнавата, бо з гэтым добрым іменем звязана ўяўленне аб дабротнай, своеасаблівай прозе. Аднак ёсць і вершы, і паэмы, і яны моцныя тым самым, што і Чарнышэвічава проза. Эпасам, умельствам адшукаць у бачанай-перабачанай з'яве незаўважанае іншымі, а, галоўнае, паказаць вядомае невядомым, зазірнуць у чалавека, а не каўзануцца вачыма па паверхні.

У Аркадзя Чарнышэвіча была свая тэма, было што сказаць, ён пісаў аб перажытым, іначай не мог. І ў гэтым увесь сэнс набыцця пісьменнікам біяграфіі: без яе не абдорыш чытача сваім духоўным вопытам.

З вялікай радасцю і ахвотаю рэкамендую чытачам газеты «Літаратура і мастацтва» незакончаную паэму А. Чарнышэвіча «У дарозе», пад якой даўняя дата — 1934. У ёй — жывая чалавечая душа, ад яе прыбывае пачуцця і ведання свету ў нас саміх.

Максім ЛУЖАНІН.

1

Ноч марозная, вецер і снег.
Скрып саней. А дарога без краю.
Добра марыць аб цёплай вясне
І дзівіцца, як зоры стухаюць.
Паабапал дарогі лясы
Расцвітаюць, гараць не згараюць...
І мае маладыя вусы
Адчуваюць, як зоры палаюць.
У кішэні пацёрты лісток,
Дарагі, хоць напісаны проста.
Мне калгаснікі з вёскі Масток
Заказным яго выслалі поштай.
Вось праеду паляну адну
І убачу гарбатыя хаты.
Там, я знаю, даўно мяне ждуць,
Як свайго гадаванца і брата.
«Прыязджай, непарадкі растуць,
Невясёлыя тварацца дзеі,
А праўленцы, ў тым ліку Кастусь,
Што прагледзелі, недаглядзелі.
З тыдзень будзе — чума на свіней
Уваліліся ведзьмай-вужакай,
І знайшлі, пагніло у гумне
Шмат пшаніцы не ў пору пажатай.
Пазаўчора у цёмную ноч
Расцяглі нашу новую збрую...
З рыштавання упаўшы, бярно
Прыдавіла Рыгора Бірулю...»
Я, Рыгор, цябе знаю даўно,
Як работніка і як змаганца.
Дык няўжо ж з рыштавання бярно
Уніз сапхнута рукою паганца!..

2

Масток — сто восемдзесят хат,
Страха ў страху, сцяна ў сцяну...
Але ж я ўмеў цябе кахаць —
Сваю калыску і вясну,..
І шэраг дзён,
І гразь двароў,
І скрып варот,
Скаціны рык,
Хацінак вечны нудны змрок
І вас, дзяды-гаспадары.

3

Я добра помню хутарок
Ля вёскі, як рудую пляму,
І два слупы каля варот,
І размалёваную браму.
І дом ля рэчкі на віду,
Шкляныя дзверы і веранду.
І Кольку рыжага, брыду,
Які ў дваццатым збег у банду.
І дуб стагодні на мяжы,
Бясёдку ціхую у садзе..
І Марка-гада, што служыў
Харунжым ў беларускай радзе...
І куст ружовы ля акна,
І ганак і шкляныя дзверы.
І балі ў доміку да дня
Распусных польскіх афіцэраў.
І шугалею на раце,
І бэз пахучы каля ганку.
І з тоўстай плёткай у руцэ
Студэнта кіеўскага Янку.
Я знаю гэтай плёткі смак,
Мае равеснікі — таксама.
У мяне й дасюль на шыі знак
Сядзіць пунцова-сіняй плямай...
Праз шэраг стоптаных гадоў
Я помню добра, нібы сёння,
І бацьку гэтых трох братоў —
Старога стульбу Радзівона.

4

Я дум сваіх не апаганю
Злачынствам суму і трывог.
Перада мною змрок агняны
Распырскаў водар у палёх.
Калісь і я любіў начлегі,
І цьму, і месяц малады.
Рабілі часта мы набегі
На Радзівонавы сады.
Бывала — ноч спаўзе на нівы,
Заход палае і гарыць,
Удалі згасаюць палахліва
Агні вячэрняе зары...
Але гады, як цягнікі,
Прайшлі стаптанымі пуцямі
І пра дзяціныя дзянькі
Часамі толькі скажа памяць.
А памяць — ты не пэўны друг
І не правераны таварыш,
З табою, як ні пасябруй,
А іншы раз, глядзі, падманеш.

5

І вось уз'ехаў на гару
(Даўно паляна за плячыма).
Я рукавіцай вочы тру:
Масток не гэткі прад вачыма.
Сілоснай вежы манумент
Страхою з месяцам гаворыць.
Стаяць адзетыя ў цэмент
Дзве велізарныя аборы.
Вятрак, дрыжачы дзед сівы,
Няўжо цябе ў раку сапхнулі!
На тваім месцы паравік
Паўстаў з трубою-харашуляй.
Будынкаў колькі нарасло!
І толькі хат старыя плямы
Міргаюць ржавымі вачамі,
Надвое дзелячы сяло.

6

Я, пражыўшы дваццаць два,
Чатырнаццаць здымаю з плеч.
Аддавалі мяне гадаваць
Чарадзе вясковых авец.
І калі палымнеў усход
І ў палях расцвіталі росы,
Я праводзіў авечы сход,
Старшыня — абарванец босы.
Дзе атавай зялёна-сіняй
Убіраецца гнойны дол,
Па грудах між бяроз-касынак
Вандравалі мы з чарадой.
А у поўдзень да ціхай рэчкі
(Эх, і мне у жыцці вязло!)
Я на стойле ганяў авечкі
У кусты кучаравых лоз.

7

Ля ракі кляны
Ды вярбіначкі.
Апусцілі яны
Уніз галіначкі.
Ой вы, вербы мае,
Удовы рэзвыя!
Што вам вецер пяе,
Што расказвае!
Ці аб прошлых днях,
Што крывёй цяклі
Па палях, лугах
Дарагой зямлі!
Як казацкі конь
Ячмяні таптаў,
Як казак-агонь
Дзеўку высватаў!
Маладзенькую
Дзеўку высватаў,
Пад вярбіначкаю
Кроў ёй высмактаў,
А рака цурчыць
Быллю-песняю.
Пасядзець, спачыць
Будзе весела.

8

Эх, і шустрыя ж авечкі!
І баяцца ж пастуха!
У хмызняках ля ціхай рэчкі
Я Рыгора сустракаў.
Каля явару старога
Можна сесці і глядзець
На рыгоравы каровы,
На сымонавых авец...
— Мы з табой, Сымоне-дружа,
Пастухі гарэтныя.
Нас гадуюць холад, сцюжа,
Людзі непрыветныя.
Ты скажы мне, што за ліха,
Як яно здарылася,
Што мне сёння Змітрачыха
Торбу даць забылася!..
— Што ж, Рыгор, мо неяк зладзім,
Будзем неяк жыць, браток.
Вось пад гэты явар сядзем
Ды падзелім мой кусок...
— Гэтак жыць далей не можна
Пастуху і жабраку.
Я ўсё роўна рана-позна
К партызанам уцяку.
Ты не чуў пра партызанаў,
Пра ярэмскага панка,
Як яны яго злавілі,
Прывязалі да дубка?
Ён да іх легіянераў
Кожны раз у лес вадзіў
І паверыш! — рэвальверам
Свайго парабка забіў.

9

Ой, курганы, крутыя курганы,
Колькі буйных пад вамі галоў!
У палях, навальніцай стаптаных,
Вы як помнікі долі былой.
Стаіцё адзінока, нямыя,
Маўчыцё. Хіба вам зразумець,
Што прыходзяць падзеі другія,
А з падзеямі гора і смерць.
Што ў палях, навальніцай стаптаных,
Прыйдуць людзі з чырвонай зарой
І насыплюць другія курганы,
Пахаваўшы у іх змагароў.
Аб іх памяць ніколі не згіне,
Іх імёнам навекі гарэць...
Заспяваем жа ў сонечным гімне
Пра жыццё, перамогшае смерць.
Ой, курганы, крутыя курганы,
Колькі буйных пад вамі галоў!
У палях, навальніцай стаптаных,
Вы як помнікі долі былой.

10

Добра спаць у шыкучай саломе
Пад вачыма калючых зарніц,
Калі сон — і сябрук і знаёмы —
Мільёнамі песень звініць.
У адпачынак адходзіць памяць,
Казкі-дзівы цвітуць у вачох...
Нехта пальцамі, як абцугамі,
Ухапіў за маё плячо:
«Уставай жа, браток Сымоне,
Ды устань ты, чаго ляжыш!
Я з сяла ўцякаю сёння —
Хай не ждуць, мужыкам скажы».
«А куды!» — Праціраю зрэнкі.
Ные цела, спакой кругом.
Ля мяне на худых каленках
У саломе стаіць Рыгор.
«Я уцёк бы і сёння ранкам,
Але як жа мне кінуць кароў!
Забяры ў Васіля пад ганкам
Мае лапці і...
Будзь здароў».
«А куды ж ты, Рыгор!
Браточак...»
І Рыгор, ўстаючы, сказаў:
«Я пайду, брат, сягоння ж ноччу
У лясы,
Шукаць партызан».
Тапалі ў серабры.
Цемната
Адплыла на далёкі заход.
Круглы месяц за рэчкай устаў
І плыве, і плыве упярод.

11

Ой, каровачкі мае
Рыжыя,
белыя.
Да паўдня у хляве
Мыкаюць
бедныя.
Змітрачыха — баба-конь,
Пуд рука,
два нага,
Вочы — жар, нос кручком —
Чыстая яга.
А ў самой тых кароў —
Толькі цёлка двух гадоў,
Радзівон басаног
Узапхнуў гамашы.
«Перамаць, гэта што ж,
Распрамаць, за каша!
Сукін сын, абармот
Дзе ён мог падзецца!
Ужо ж пасе трэці год,
Дык нашто надзеецца!
Як ты тут ні вазьмі,
Не ўлагодзіш хама.
Хоць кармі,
раскармі
Усё роўна дарма».

12

Вандравалі ветры у палях стаптаных,
Вандравалі ветры да пары...
«Ой ты, маці, маці, чаму ўстала рана!
Чаго плачаш маці, гавары!»
«У палях разоры крывёю паліты,
Мерцвякі начамі устаюць...
А мае сыночкі у баях забіты,
У сырой зямельцы косці іх гніюць».

13

Як наехалі ліхія варагі,
Нашы нівы патапталі
І лугі.
Ой ты, рэчанька, крутыя берагі
Чырванілі твае хвалі
Нашай кроўю варагі.
Польскі коннік праязджае па дварох,
Шабля гострая зіяе
Серабром.
Гэй, выносьце сала, масла і тварог,
Ожэл бялы вас хавае,
Беражэ ваша дабро!
Стукацяць па вуліцы капыты,
Пахаваліся дзяўчаты
У куты.
Вепрука хавае дзядзька Кастантын,
А вяпрук такі упарты.
«Што вішчыш, не выдах ты...»
Крышаць скрыні ворагі ў жанок.
Палатно вязуць вазамі.
Знай, Масток:
Так шукаюць партызанаў.
Сцеражыся, мужычок!
Радзівон на вуліцу да гасцей:
«Прыязджайце ды, панове,
Пачасцей».
А ў гародчыку шыпшыначка расце,
Там жаўнер дзяўчыну ловіць,
А сам з плёткай у руцэ.
Афіцэр-страшылішча рот скрывіў.
І мундзір у афіцэра
У крыві.
Радзівон яму на вуха (пан да гэтага
прывык):
«Вунь жыве, панок, задзіра,
Сын у лесе. Бальшавік».
Дзе ж ты быў, Рыгоранька, сірата,
Калі бацьку расстралялі
Свалата...
Асталіся ад згарэўшага Мастка
Кучы чорнага вугалля,
Попел, дым і пустата...
...Я, Рыгор, цябе знаю даўно
Як работніка і як змаганца,
Дык няўжо ж з рыштавання бярно
Уніз сапхнута рукою паганца!

1934.

Паэма друкуецца з некаторымі скарачэннямі.

«ЗОННТАГ» ПРА БЕЛАРУСКІ РАМАН

Культурна-палітычны штотыднёвік «Zonntag», які выдаецца ў ГДР Саюзам таварыстваў культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, у нумары за 4 лютага гэтага года пад рубрыкай «Міжнародныя рэцэнзіі на лепшыя прачытаныя кнігі» змяшчае артыкул свайго літаратурнага аглядальніка Т. Н. Брарона пра раман-хроніку Максіма Гарэцкага «Віленскія камунары», выдадзены ў свет выдавецтвам «Беларусь» у 1965 годзе.

Рэцэнзент, адзначыўшы той факт, што раман «выдатнага беларускага стыліста і гісторыка літаратуры» выйшаў у перакладзе на рускую і іншыя мовы, а яго раннія кнігі, у прыватнасці, кніга нарысаў «На імперыялістычнай вайне» была перакладзена на нямецкую мову і выйшла ў Аўстрыі задоўга да «аншлюса» і атрымала там самыя станоўчыя водгукі літаратурнай крытыкі, рэкамендуе раман-хроніку «Віленскія камунары» для перакладу на нямецкую мову ў ГДР як «адну з лепшых кніг аб сумеснай барацьбе братніх народаў — беларускага і літоўскага — за сваё нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне».

Т. Н. Брарон не абмяжоўваецца разглядам рамана М. Гарэцкага «Віленскія камунары», а спрабуе вызначыць месца беларускай літаратуры ў сям'і еўрапейскіх літаратур. У сувязі з гэтым нямецкі крытык піша: «Васьмімільённы гераічны народ, які, згодна з апошнімі афіцыйнымі статыстычнымі дадзенымі, лічыць сваёй роднай мовай беларускую, гаворыць на ёй дома і стварае на гэтай мове выдатныя мастацкія творы — народ, які займае вялікую прастору цэнтральна-ўсходняй Еўропы ад З. Буга да вярхоўяў Дняпра на ўсходзе і ад Заходняй Дзвіны да Прыпяці з поўначы на поўдзень, сусед літоўцаў, палякаў, украінцаў і рускіх — народ, суверэнная рэспубліка якога з'яўляецца раўнапраўным членам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый з дня заснавання гэтага супольніцтва народаў, мае такую літаратуру, і ў прыватнасці, паэзію і раманістыку, якая заслугоўвае самай высокай увагі і ацэнкі ў сусветным маштабе. На вялікі сорам Еўропы і нас, немцаў, да апошняга часу, мабыць, ні адна з літаратур еўрапейскіх народаў не была так мала вядома на Захадзе, як беларуская».

Далей Т. Н. Брарон гаворыць: «Пасля свайго дзівоснага росквіту ў старажытныя часы рэнесансу, калі ў Вялікім Літоўска-беларускім княстве старажытная беларуская мова лічылася афіцыйнай, беларуская літаратура ў выніку палітычнага і культурнага прыгнёту краіны польскімі панамі і сатрапамі царскай Расіі на доўгія часы прыйшла ў заняпад. На пачатку мінулага XIX стагоддзя ўвесь культурна-славянскі свет (ды і не толькі ён!) ахнуў, убачыўшы веліч і хараство душы народа ў яго песнях і казках, якія былі па крупіцах сабраны і апублікаваны патрыятычна настроенымі энтузіястамі—этнографамі і літаратарамі Польшчы і былой царскай Расіі. З гэтых невычэрпных крыніц піла і набіралася жыватворчых сокаў маладая беларуская літаратура, якая падымалася ў рост сама і заклікала свой народ да новага жыцця. Але толькі ў наш, XX век, і, дакладней, толькі пасля Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі атрымала яна, мастацкая літаратура беларусаў, усе ўмовы для свайго развіцця і росквіту. За 50 гадоў Савецкай улады беларуская савецкая літаратура, дасягнуўшы нябачнага росквіту за ўсю сваю шматвекавую гісторыю, заняла пачэснае месца не толькі ў шэрагах братніх нацыянальных літаратур народаў Савецкага Саюза, але і атрымала прызнанне ва ўсім свеце як адна з самых багацейшых нацыянальных літаратур народаў Еўропы.

Яскравая, мазаічная карціна беларускай паэзіі і прозы новымі фарбамі і колерамі, кампазіцыямі і глыбінёй раскрыцця вобразаў асабліва ўзбагацілася за апошняе пасляваеннае дваццацігоддзе. Буйнейшыя беларускія паэты і празаікі, імёны якіх сталі вядомы чытачам не толькі ўсяго Савецкага Саюза, але і шырокаму чытачу іншых краін далёка за межамі СССР сваёй плённай стваральнай працай садзейнічалі яе зайздроснаму ўздыму і славе. Мы ў ГДР, таксама маглі ў гэтым пераканацца ў апошнія гады па некалькіх іх новых раманах, аповесцях і зборніках апавяданняў, якія з'явіліся ў нас у перакладах на нямецкую мову, хаця, на вялікі жаль, скарбы сучаснай беларускай паэзіі для нас яшчэ пакуль што не раскрыты».

НАШ ГОСЦЬ— ТЭАТР БАЛТФЛОТУ

Яшчэ адзін штрых, і фельдмаршал Кутузаў пойдзе на сцэну.
Фота Ул. МЯЖЭВІЧА.

Першае знаёмства беларускіх гледачоў з Драматычным тэатрам двойчы Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту адбылося шэсць гадоў таму назад. І тады гэта быў ужо сталы творчы ансамбль са сваім рэпертуарам, сваім абліччам.

Біяграфія тэатра пачынаецца ў 1930 годзе. Баявое хрышчэнне атрымаў ён у дні вайны з белафінамі. У суровыя гады Вялікай Айчыннай калектыў тэатра быў баявым падраздзяленнем у радах маракоў-балтыйцаў. Толькі за першыя трынаццаць месяцаў вайны ён даў для франтавікоў тры тысячы спектакляў і канцэртаў.

— І ў мірныя гады,—сказаў начальнік тэатра В. Сперанскі,—наш тэатр дастойна прадстаўляе савецкае мастацтва. Ён выступаў у Ленінградзе, Кранштаце, Таліне, Кіеве, Львове, Віцебску, Гродна, Калінінградзе і іншых гарадах Савецкага Саюза. Некалькі разоў калектыў дэманстраваў сваё мастацтва ў Польскай Народнай Рэспубліцы і Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы.

З вялікім творчым уздымам сустрэлі мы 50-годдзе Вялікага Кастрычніка, прысвяцілі юбілею два спектаклі — «6-е ліпеня» М. Шатрова і «Разлом» Б. Лаўранёва.

Усе мінулыя нашы выступленні ў Беларусі праходзілі з поспехам. Хочацца, як кажуць, і на гэты раз парадаваць гледачоў, тым больш, што нашы гастролі супалі з вялікай падзеяй у жыцці Савецкай краіны — 50-гадовым юбілеем Узброеных Сіл. Да гэтага свята мы спецыяльна падрыхтавалі прэм'еру «Брандэнбургскіх варот» М. Святлова.

Першы спектакль паказалі ў Полацку, потым выступалі ў Наваполацку і ў Віцебску. Заканчваем свае гастролі на сцэне акругновага Дома афіцэраў у Мінску спектаклямі «Брандэнбургскія вароты» М. Святлова, «Цвыркун» Т. Кажушніка і «Даўным-даўно» А. Гладкова.

...«Даўным-даўно». Гэтая камедыя, як кажуць, даўным-даўно знаёма савецкаму гледачу. Яна з поспехам ішла ў тэатрах Масквы і іншых гарадоў краіны. Шчаслівы быў лёс п'есы і ў кіно: рэжысёр Э. Разанаў паставіў па ёй «Гусарскую баладу», якая з поспехам абышла экраны Савецкага Саюза.

...У паўзмроку глядзельнай залы чуваць знаёмая мелодыя. З'яўляецца Шура Азарава (арт. Н. Добрыкава). Лёгкая, імклівая, у гусарскім мундзіры, яна адразу ж становіцца цэнтрам дзеяння. Маладая актрыса, дарэчы сказаць, выпускніца Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, вельмі дакладна малюе характар сваёй гераіні. А гэта нялёгка, бо ў актрысы, па сутнасці, дзве ролі. Прыемна, што яна ў поўнай меры спраўляецца з імі.

Ролю гусара Ржэўскага, аматара выпіць і пазаляцацца да выпадковай красуні, але спрытнага і смелага воіна, выконвае артыст В. Каробкін. Вопытны акцёр знайшоў для вобраза свае фарбы. У яго выкананні гусар Ржэўскі яркі і пераканаўчы.

Вялікая адказнасць у спектаклі лягла на заслужанага артыста Латвійскай ССР Ю. Саркісава. Ён заняты ў дзвюх ролях — Кутузава і Дзюсьера. Яны ва ўсіх адносінах розныя, цікавыя, але, на наш погляд, больш яму ўдалася роля Кутузава.

Трэба адзначыць і добрую работу заслужаных артыстаў Латвійскай ССР Н. Церахава (Азараў), С. Антаноўскага (Нурэн) і артыста А. Ткачова (Іван). Вобразы, створаныя імі, праўдзівыя і эмацыянальныя.

І ўсё ж акцёры і пастаноўшчык — галоўны рэжысёр тэатра заслужаны дзеяч мастацтваў Літоўскай ССР В. Каплін не пазбеглі недахопаў. Непераканаўчымі выглядаюць «французы»; музыку Т. Хрэннікава хацелася б чуць у аркестравым гучанні; ва ўгоду дынаміцы і рытму спектакля некаторыя акцёры спяшаюцца, не даносяць да гледача тэкст п'есы...

Гастролі драматычнага тэатра двойчы Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту падыходзяць да канца. Але ўжо зараз, падводзячы некаторыя вынікі, можна сказаць, што яны былі паспяховыя.

М. ТЫНЯНСКІ.

НА МОВАХ СВЕТУ

Кнігі заснавальніка Савецкай дзяржавы У. І. Леніна, кнігі пра Леніна можна ўбачыць у Савецкім Саюзе не толькі на паліцах дзяржаўных, грамадскіх, ведамасных бібліятэк. Яны ёсць у вельмі многіх дамах — ад рабочага і калгасніка да акадэміка. Тыраж Лeніняны — адна трэцяя частка мільярда экземпляраў, выпушчаных рознымі савецкімі выдавецтвамі на 95 мовах народаў СССР і зарубежных краін. На першыя дзесяць тамоў пятага дадатковага выдання збораў Леніна, якое выходзіць у гэты час, ужо дадзены заяўкі ад 120 тысяч падпісчыкаў. Не меншым попытам карыстаюцца розныя кнігі аб правадыры.

Да стагоддзя з дня нараджэння нарыфея навуковай рэвалюцыйнай думкі (22 красавіка 1970 года) савецкія кнігавыдавецтвы выпусцяць яшчэ больш за 700 кніг, з іх 500 у саюзных рэспубліках.

Маскоўскае выдавецтва палітычнай літаратуры да гэтага года закончыць выпуск пятага дадатковага тыражу ўсіх 55 тамоў поўнага Збору твораў У. І. Леніна.

Другім выданнем выйдзе ў тым жа выдавецтве кніга «Скарбніца вялікіх ідэй ленінізма», якая характарызуе поўны Збор твораў Леніна, паказвае асаблівасці пятага выдання.

У Маскве рыхтуецца пяцітомнае выданне ўспамінаў аб правадыры савецкага народа, перапіска сям'і Ульянавых, біяграфія У. І. Леніна, у тым ліку і для дзяцей.

У выдавецтве «Міжнародныя адносіны» рыхтуецца серыя зборнікаў, якія расказваюць пра Леніна, стратэга і майстра палітычнай тактыкі, аб паслядоўным правядзенні ідэй ленінізма ў савецкай знешняй палітыцы.

На англійскай, нямецкай, французскай і іспанскай мовах выдавецтва «Мір» пазнаёміць чытачоў з кнігай «Ленінізм і сучаснае прыродазнаўства».

Вялікую цікавасць для савецкіх і зарубежных чытачоў уяўляюць таксама 75 кніг, прысвечаных вобразу Леніна ў мастацкай літаратуры і ў выяўленчым мастацтве.

Сярод юбілейнай Ленініяны — рэпрадукцыі з карцін вядомых савецкіх мастакоў, фотаальбомы, розныя сувенірныя выданні.

АДН.



САКАВІК

Фотаэцюд Я. МЯЦЕЛІЦЫ.

І ГАРМОНІЯ, І АЛГЕБРА

У ЛАБАРАТОРЫІ ТЭХНІЧНЫХ СРОДКАЎ НАВУЧАННЯ ПРЫ ІНСТЫТУЦЕ ІМЯ ГНЕСІНЫХ

— Праверыў я алгебрай гармонію, — так гаворыць Сальеры ў Пушкіна. Праз некалькі гадзін ён усыпле атруту ў шклянку Моцарта, каб надоўга стаць хрэстаматыйным узорам нізкай зайздрасці. Між тым Пушкін піша і аб мастацтве, дзе немагчыма **«пяшчоце творчай мары аддавацца»**, не паставіўшы спачатку **«рамяство... мастацтву пастаментам»**.

Прасцей кажучы, не навучыўшыся прафесіянальным асновам свайго мастацтва, немагчыма тварыць. Я міжволі ўспомніў гэты паэтычны вобраз Пушкіна і пераклаў яго на далёкую ад паэзіі мову журналіста, калі ўбачыў у Музычным інстытуце імя Гнесіных дзіўны гібрыд — фартэпіяна, звязанае пучком правадоў з электронна-механічным прыстасаваннем. Тут жа я пазнаёміўся са стваральнікам гэтага унікальнага «навучальнага фартэпіяна» — Паўлам Васільевічам Лабанавым, навуковым кіраўніком лабараторыі тэхнічных сродкаў навучання пры інстытуце. Лабараторыя ўзнікла зусім нядаўна і, акрамя Лабанава, мае толькі аднаго супрацоўніка.

— Мая маці была піяністка, а бацька — інжынер-электрык; яны з дзяцінства цягнулі мяне ў розныя бакі, — расказвае Павел Лабанаў. — Мяне ж самога, бадай што, больш за ўсё цікавіла тады астраномія, больш як дзесяць гадоў я нават быў членам астранамічнага таварыства.

І ўсё-такі астраномам ён не стаў. Спачатку, у час вайны, Лабанаў працаваў электрыкам у рэлейнай ахове высакавольтавых сетак. Але неўзабаве захапіўся ігрой Уладзіміра Сафраніцкага і, даведаўшыся, што гэты выдатны піяніст стаў прафесарам Маскоўскай кансерваторыі, кінуў усё і паступіў да яго ў клас. У 1949 годзе ён закончыў кансерваторыю па класу фартэпіяна і стаў працаваць выкладчыкам у Музычным інстытуце імя Гнесіных. Здавалася, тэхнічныя інтарэсы пакінуты назаўсёды.

Але нечакана веды электрыка зноў спатрэбіліся.

— Я пачаў займацца са студэнтамі-завочнікамі, — успамінае Лабанаў, — і адразу ж сутыкнуўся з праблемай, як вучыць музыцы і кантраляваць студэнтаў на адлегласці? Так мне прыйшла ў галаву ідэя агучаных вучэбных дапаможнікаў.

Спачатку яны былі вельмі простыя—Лабанаў запісваў на цэлулоідных пласцінках музычныя прыклады з педагагічнымі каментарыямі і рассылаў іх сваім студэнтам. Пазней разам з іншымі выкладчыкамі інстытута пачаў запісваць на магнітную стужку музыказнаўчы разбор якога-небудзь твора, запіс адкрытага ўрока або гутаркі. Вялікай перавагай такіх дапаможнікаў стала тое, што ўсе прыклады даваліся ў арыгінальным гучанні, у той час як у звычайных друкаваных дапаможніках і падручніках замест гучання жывой музыкі прыводзіцца толькі нотны тэкст. Пэўную аналогію тут можна знайсці з выкладаннем моў з дапамогай грампласцінак і магнітафільмаў, якое таксама пачало ў той час рабіць першыя крокі ў Савецкім Саюзе і цяпер шырока распаўсюдзілася.

З сярэдзіны пяцідзесятых гадоў Лабанаў шукае новыя формы выкладання тэарэтычных дысцыплін. На пласцінках і стужках ён пачынае запісваць музычныя дыктанты для самастойнай работы навучэнцаў. Такія запісы добра прыдаліся і для курсаў сальфеджыо, гармоніі, аналізу форм, дзе раней усе ілюстрацыі даваліся педагогамі толькі ў фартэпіянным пераладжэнні, пры якім страчвалася разнастайнасць тэмбраў і маляўнічасць гучання аркестравага выканання. Акрамя таго, Лабанаў робіць так званыя запісы «—І», гэта значыць запісы ансамбля без партыі аднаго з удзельнікаў. Гэтую партыю студэнт можа выканаць «у ансамблі» з магнітафонам, які ўзнаўляе запіс. Такая ж сістэма запісу можа ўжывацца і пры двухгалосым сальфеджыраванні. Запісы «—І» ужываліся ўжо ў пачатку стагоддзя на механічных фартэпіяна і цяпер шырока распаўсюджаны ў ЗША. Аднак ва ўсіх выпадках яны прызначаліся для аматараў музыкі, а не для прафесіянальнага навучання.

І педагогі, і студэнты шчыра зацікавіліся новымі метадамі навучання, якія прапанаваў Лабанаў. Агучаныя дапаможнікі распаўсюджваюцца ўсё шырэй і шырэй, і асабліва пасля 1959 года, калі Усесаюзная студыя грамзапісу пачала серыйны выпуск пласцінак, прысвечаных выканаўчаму майстэрству, тэарэтычным дысцыплінам, гісторыі музыкі. Зараз выпушчаны, напрыклад, на пласцінках Саната № 6 Бетховена, «Поры года» Чайкоўскага, Партыта № 2 (для скрыпкі) І. С. Баха і іншыя. Яшчэ ў пачатку пяцідзесятых гадоў Лабанаў рабіў запісы заняткаў вялікіх майстроў — Сафраніцкага, Нейгауза, Гутмана. Цяпер частка гэтых твораў таксама запісана на грампласцінках, і з імі могуць пазнаёміцца студэнты і педагогі. Такая магчымасць распаўсюджвання педагагічнага вопыту выдатных выканаўцаў, якім раней магла карыстацца толькі невялікая група студэнтаў, — вельмі важная і шматабяцаючая.

На Міжнароднай канферэнцыі па музычнаму выхаванню ў Будапешце (1964) была прадэманстравана адна з такіх пласцінак-дапаможнікаў і атрымала высокую ацэнку як першая ў сваім родзе. Зараз падрыхтоўка дапаможнікаў на магнітафільмах і пласцінках складае важную частку работы Лабараторыі тэхнічных сродкаў навучання. Важную, але зусім не адзіную.

Гадоў пяць назад агульныя тэндэнцыі ўсё большага развіцця тэхнічных сродкаў і праграмавання ў навучанні навялі Лабанава на думку: ці нельга паспрабаваць што-небудзь такое і ў музыцы. Інтарэсы музыкі і тэхнікі, якія так спаборнічалі ў ім дваццаць гадоў назад, далі нечаканы і плённы сінтэз. У 1962 годзе, працуючы выкладчыкам, ён пачаў і праз два гады закончыў работу над электронна-механічным прыстасаваннем — машынай для навучання тэарэтычным прадметам, якая атрымала ўмоўную назву «Л-1».

Да магнітафона падключана металічная скрынка, памерамі не больш за звычайны прайгравальнік, на яе верхняй плоскасці з двух бакоў — кнопкі з сігнальнымі лямпачкамі, а насярэдзіне закладваецца карта з пералікам магчымых адказаў. Працэс навучання ідзе па метаду выбару правільнага адказу (звычайна аднаго з дваццаці магчымых) і яго замацавання. Як вучэбны матэрыял машына можа выкарыстаць урыўкі з музычных твораў, а таксама асобныя музычныя элементы: інтэрвалы, акорды, тэмбры інструментаў. Напрыклад, на магнітафоннай стужцы запісаны рад акордаў, а на картачцы іх умоўнае абазначэнне; трэба вызначыць акорд, яго размяшчэнне і меладычнае становішча. Вы ўключаеце магнітафон: гучыць першы акорд. Калі вы націскаеце на кнопку з правільным адказам, побач запальваецца сігнальная лямпачка, і можна слухаць наступны акорд. Калі ваш адказ няправільны, можна спрабаваць яшчэ два разы, і толькі пасля трох няправільных адказаў успышка сігнальнай лямпачкі сама пакажа вам правільны. Гэтыя тры дапушчальныя адказы ўзяты зусім адвольна, наогул жа іх можа быць і два і чатыры.

Мы прывялі прыклад з акордамі. А калі б у машыну было ўведзена заданне па гісторыі музыкі, калі б спатрэбілася вызначыць узрост і імя кампазітара, жанр і назву твора? Пералік адказаў пабудаваны па прынцыпу «правільна-няправільна» і ўключае ўсе магчымыя адказы, не дапускаючы абсурдных. Адначасова вядзецца падлік адказаў. Суадносіны правільных адказаў да іх агульнага ліку 18/25, напрыклад, лічацца добрымі, а 6/25 — ужо нездавальняючымі.

Такая машына, зразумела, не прэтэндуе на тое, каб замяніць педагога. Яна бярэ на сябе найбольш механічную і працаёмкую частку яго работы, з другога боку — дае студэнту магчымасць старанней і працяглай трэніроўкі, якую яму не можа забяспечыць ні адзін педагог. Да 1967 года Лабанаў зрабіў шэсць мадэляў машын, яны шырока выкарыстоўваюцца ў інстытуце імя Гнесіных. Між іншым, адна з мадэляў неўзабаве пойдзе ў серыйную вытворчасць і, трэба думаць, добра дапаможа студэнтам і выкладчыкам музычных вучылішчаў, інстытутаў краіны.

Апошняя мадэль Лабанава «Л-7» — гэта «навучальнае фартэпіяна».

Работа над машынай супала з арганізацыяй лабараторыі, і дзейсны ўдзел у пабудове і наладцы «навучальнага фартэпіяна» прыняла Эма Радцыг — старшы інжынер лабараторыі. Яна скончыла Маскоўскі авіяцыйны інстытут і працавала ў авіяцыйнай прамысловасці, але любоў да музыкі і добры голас прывялі яе на завочнае аддзяленне вакальнага факультэта інстытута імя Гнесіных.

«Навучальнае фартэпіяна» зроблена па прынцыпу машын з адваротнай сувяззю. На клавіятуры фартэпіяна ўстаноўлена кантактная рэйка, якую можна здымаць, прычым кожнай клавішы фартэпіяна адпавядае кантакт з сігнальнай лямпачкай. Рэйка падключаецца да электронна-механічнага прыстасавання, у якое закладваецца пэўная праграма, выбітая на перфакарце. Тая ж праграма, але ўжо ў выглядзе нотнага або магнітафоннага запісу прапануецца для выканання студэнту. Цяпер можна пачынаць гульню. Сігнальная сістэма сігналізуе аб зробленых памылках, папраўляе студэнта і дае ўказанне працягваць гульню. Вядома, «навучальнае фартэпіяна» не вучыць выканаўчаму майстэрству, не вучыць ігры на фартэпіяна. Але кожны раз на ім можна ставіць пэўныя задачы, будзь гэта вывучэнне тэорыі музыкі або чытанне з ліста.

Усё гэта толькі пачатак вялікай работы па стварэнню і ўкараненню ў практыку музычных навучальных машын. Тое, што робіць лабараторыя пад кіраўніцтвам Лабанава, адпавядае духу нашага часу — духу ўсё большага пранікнення тэхнічных і дакладных навук у галіну музыкі.

Андрэй АМАЛЬРЫК (АДН).

КНІГІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ— КЛОПАТЫ АБ МАЛЕНСТВЕ

Кнігі для дзяцей мільённымі тыражамі (толькі ў 1966 годзе выпушчана 2.574 кнігі тыражом 213 мільёнаў 43 тысячы экземпляраў) выпускаюць буйныя выдавецтвы СССР: «Детская литература», «Малыш», «Просвещение», «Молодая гвардия», «Советская Россия», «Художественная литература», рэспубліканскія выдавецтвы.

Перш чым выпусціць кнігу, выдавецтвы вывучаюць інтарэсы дзяцей. Гэтую работу вядуць бібліятэкі — іх тысячы. Яны ў кожным горадзе, раёне, у кожнай школе, на прадпрыемствах. Іх дзейнасць аб'ядноўвае цэнтральная арганізацыя — Дом дзіцячай кнігі, заснаваны ў Маскве ў 1949 годзе як творчая лабараторыя выдавецтва «Детская литература». Тут вывучаюць жыццё кнігі, попыт юных чытачоў, дапамагаюць школе, бібліятэкам, сям'і кіраваць дзіцячым чытаннем. Больш 20 тысяч пісьмаў чытачоў атрымлівае штогод Дом дзіцячай кнігі з розных краін. Перапіска з дзецьмі дапамагае зразумець попыт і чытацкія інтарэсы дзяцей.

Дом дзіцячай кнігі праводзіць канферэнцыі чытачоў, дыспуты, крытычныя агляды дзіцячых кніг. Яго супрацоўнікі выязджаюць у розныя гарады і вёскі, прыцягваюць пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў, работнікаў бібліятэк да распрацоўкі найбольш актуальных пытанняў крытыкі, тэорыі і гісторыі дзіцячай літаратуры і кіраўніцтва дзіцячым чытаннем. Лепшыя даклады і рэфераты публікуюцца ў штогодніках Дома дзіцячай кнігі.

У навуковай бібліятэцы Дома, якая налічвае больш 200 тысяч кніг, працуюць пісьменнікі, мастакі, крытыкі, літаратуразнаўцы, рэдактары — усе тыя, што цікавяцца дзіцячай літаратурай. Бібліятэка атрымлівае дзіцячыя кнігі з усіх краін свету і сістэматычна знаёміць з імі сваіх чытачоў, наладжвае ў сябе выстаўкі дзіцячай зарубежнай кнігі, пасылае за рубеж і свае. Жыхары Лондана пісалі ў кнізе водгукаў выстаўкі савецкай дзіцячай кнігі ў Каралеўскай фестывальнай зале: «Добры шлях да дружбы. Кнігі для дзяцей паказваюць клопаты аб дзяцінстве», або «Дзіцячыя кнігі, па-мойму, сапраўды вельмі цікавыя, і я лічу, што лепшы спосаб пазнаць любы народ — паглядзець, што яны даюць чытаць дзецям».

Адбылося нямала творчых сустрэч з замежнымі дзеячамі асветы, пісьменнікамі з 60 краін. Вялікае значэнне для развіцця дзіцячай літаратуры і ўзаемасувязей дзіцячых пісьменнікаў свету меў Міжнародны сімпозіум у Празе, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі Японіі, Чэхаславакіі, Галандыі, Польшчы, Югаславіі, Францыі, Італіі, ФРГ, СССР і іншых краін. Яго мэта — прыцягнуць увагу грамадскасці да высакародных задач дзіцячай літаратуры і да барацьбы супраць той, якая разбэшчвае і калечыць душу дзіцяці.

Нямала цёплых слоў было сказана аб савецкіх дзіцячых кнігах. Французская пісьменніца Андрэа Клер адзначыла гуманны і прагрэсіўны характар савецкай дзіцячай літаратуры і неабходнасць яе распаўсюджвання. Японская пісьменніца Маміка Інуі лічыць, што прынцыпы савецкіх пісьменнікаў самыя гуманныя, праўдзівыя і карысныя для падрастаючых пакаленняў. «Югаслаўская літаратура, — сказала югаслаўская пісьменніца Міра Алечкавіч,—імкнецца следаваць прынцыпам развіцця савецкай дзіцячай літаратуры».

АДН.

ГЛЫБОЦКІЯ КНІГАЛЮБЫ

Сем гадоў працуе грамадскі савет пры Глыбоцкай кнігарні. Узначальвае яго загадчыца раённай бібліятэкі Надзея Наранович.

У савеце адзінаццаць кнігалюбаў. Кожнаму даручаны пэўны ўчастак работы. Актывісты пазнаёміліся з літаратурай мінулых гадоў выдання, якая захоўвалася на складзе і ў магазінах раёна, дапамаглі рэалізаваць многа каштоўных выданняў.

Ніводная нарада ў раёне не праходзіць без удзелу членаў грамадскага савета кнігарні. Да злёту перадавікоў сельскай гаспадаркі, напрыклад, члены савета зрабілі ў фае Дома культуры тэматычную выстаўку па раздзелах «Для вас, механізатары», «У дапамогу даярцы», «Рэкамендуем прачытаць аграному», «Угнаенне — залог высокіх ураджаяў». Выстаўка дапамагла ўдзельнікам злёту набыць патрэбныя ім кнігі.

З дапамогай актывістаў калектыў Глыбоцкай раённай кнігарні (загадчыца Таццяна Логінава) з месяца ў месяц перавыконвае план.

Віцебскі аблспажыўсаюз абагуліў вопыт глыбоцкіх кнігалюбаў. У вобласці працуюць ужо 16 грамадскіх саветаў садзеяння прапагандзе і распаўсюджванню кнігі.

А. ІВАНОЎ.

ПАМЯЦІ Г. П. ГЛЕБАВА

У нядзелю споўніўся год з дня смерці народнага артыста СССР Глеба Паўлавіча Глебава. Каб аддаць даніну памяці выдатнаму майстру беларускай сцэны, на могілках сабраліся акцёры сталічных тэатраў, блізкія і прыхільнікі яго таленту. На магілу Г. П. Глебава былі ўскладзены жывыя кветкі.

Весела прайшло ў мінскім парку Чалюскінцаў свята праводзін зімы. На адкрытай эстрадзе выступілі студэнты тэатральна-мастацкага інстытута. Гераінямі свята сталі Снягурачка (Наташа Беражная) і Вясна (Люба Цімохава).
Фота М. МІНКОВІЧА.

„ДЫПЛАМАТЫ"

ДАКУМЕНТАЛЬНЫ ФІЛЬМ АБ ПЕРШЫХ КРОКАХ САВЕЦКАЙ ДЫПЛАМАТЫІ

На Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў некалькі месяцаў ідзе работа над карцінай «Дыпламаты», сцэнарый Сямёна Зеніна і Аляксандра Навагрудскага, рэжысёр Віктар Лісаковіч. Аўтары фільма расказваюць аб першых савецкіх дыпламатах, аб некаторых старонках гісторыі савецкай знешняй палітыкі.

Здымачная група сабрала унікальныя хранікальныя здымкі, на якіх увекавечаны Чычэрын і Літвінаў, Красін і Вароўскі, Карахан і Сурыц, іншыя савецкія дыпламаты. Гэта дазволіць узнавіць на экране яркую гісторыю станаўлення савецкіх дыпламатычных органаў і асноўных прынцыпаў савецкай дыпламатыі.

У цэнтры карціны — вобраз першага народнага камісара замежных спраў Чычэрына. Чалавек бліскучай эрудыцыі, таленавіты музыкант, Чычэрын адмовіўся ад кар'еры царскага дыпламата, каб уступіць у рэвалюцыйную барацьбу. За агітацыю сярод англійскіх рабочых Чычэрын быў арыштаваны. Кастрычніцкую рэвалюцыю ён сустрэў у Брыкстонскай турме.

Аўтары фільма выкарыстоўваюць цікавы прыём — сутыкаюць два кінапартрэты: Лойд-Джордж і Чычэрын. Адзін — брытанскі прэм'ер-міністр, другі — вязень Брыкстонскай турмы. Наўрад ці тады, у 1917 годзе, прэм'ер-міністр ведаў што-небудзь пра Чычэрына, але пройдзе ўсяго некалькі гадоў, і яны сутыкнуцца твар у твар на Генуэзскай канферэнцыі. І былы вязень нанясе сакрушальны ўдар прэм'ер-міністру ў дыпламатычнай дуэлі, і мір назаве гэта бліскучай перамогай савецкай дыпламатыі.

На Генуэзскай канферэнцыі ўпершыню прагучаць словы «мірнае суіснаванне», «скарачэнне ўзбраенняў». З трыбуны гэтай канферэнцыі прагучыць прамова аб ленінскіх прынцыпах знешняй палітыкі. Тут пачнецца барацьба, якая будзе працягвацца да нашых дзён, барацьба, аб якой Лойд-Джордж пісаў: «Падобна да вялікіх драм мінулага, Генуя адлюстравала сутыкненне дзвюх магутных сіл, дзвюх страсцей, двух супрацьлеглых поглядаў. Я магу сказаць — двух светаў — старога і новага...»

Кіналетапіс захаваў драматычныя эпізоды гэтай барацьбы. Мы бачым дыпламатаў, якія са здзіўленнем разглядваюць савецкіх прадстаўнікоў. Як непадобны яны на тых лахматых страшыдлаў, якімі іх малявалі тагачасныя карыкатурысты заходніх газет. На трыбуну ўзнімаецца элегантны чалавек з разумным, некалькі іранічным тварам і гаворыць прамову спачатку па-французску, потым па-англійску. Прамову гэтую слухае малады амерыканец, які сядзіць у ложы прэсы: нікому невядомы, пачынаючы рэпарцёр Эрнест Хемінгуэй. Ён запісвае ў блакноце: «Здавалася, што атмасферу гэтай залы прарэзала летняя маланка...»

Як спалохала гэтая маланка прадстаўнікоў капіталістычнага свету! Яны пратэставалі, адмаўляліся прызнаваць Савецкую Расію. У сваіх спрэчках з бальшавікамі яны выкарыстоўвалі і зусім не дыпламатычныя прыёмы.

Аўтары фільма раскажуць аб умовах, у якіх даводзілася працаваць першым савецкім дыпламатам. Літаральна на кожным кроку іх падпільноўвала небяспека. У Стакгольме, дзе працаваў паўпрэд Вароўскі, арудавала «ліга забойцаў», белагвардзейская банда, якую ўзначальваў былы царскі палкоўнік. Яны праследавалі і забівалі тых, хто быў звязаны з савецкай місіяй. На віле Бальтанес, у рэзідэнцыі банды, паліцыя знайшла трупы забітых у мяшках і прыгатаваныя мяшкі з надпісамі. На адным з мяшкоў было напісана «Бальшавіцкі камісар Вароўскі».

Тады забойства ўдалося папярэдзіць. Куля белагвардзейскага найміта нагнала Вароўскага праз некалькі гадоў у Лазане. Кінааператары тых гадоў адлюстравалі жалобнае шэсце: Вароўскі, паўпрэд у Польшчы Войкаў, дыпламатычны кур'ер Нетэ...

Але адразу за гэтым пойдуць другія кадры: 1924 год, год прызнання. Заходнія дзяржавы адна за другой устанаўлівалі дыпламатычныя адносіны з Савецкай Расіяй. І зноў — Чычэрын. На гэты раз сярод дыпламатаў замежных дзяржаў, акрэдытаваных у Маскве. Заключным акордам фільма прагучаць яго словы: «Народы, якія жывуць на адной планеце, пры ўсіх адрозненнях сацыяльных сістэм, павінны існаваць побач адзін з адным».

Гісторыя пацвердзіла жыццёвасць гэтага вялікага ленінскага прынцыпу.

Алена МІНКІНА (АДН).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

5 сакавіка

Першая праграма. 10-30 — школьны экран. Для вучняў 9-га класа. Беларуская літаратура. М. Багдановіч. 17-00 — «Навіны». 17-10 — праграма перадач. 17-15— «Я з табой Ташкент». Кінанарыс. 17-35 — «Усё ў імя чалавека, на карысць чалавека». Выступленне кандыдата гістарычных навук Е. Васілеўскай. «1921—1925 гг.». Гутарка другая. 17-55 — дзіцячы экран. «Пін і Гвін». Лялечны фільм. «Хто працуе для вас». Тэлевізійны фільм. 18-30 — для слухачоў школ асноў марксізма-ленінізма. Палітэканомія сацыялізма. «Грамадскія фонды спажывання і іх выкарыстанне». Гутарка 4-я (М). 19-00 — камерныя цыклы. Я. Глебаў. Вакальны цыкл «Памятаю». 19-20 — «Подзвігі нашых землякоў». Пра А. Ф. Лук'яненку, якая ў гады Вялікай Айчыннай вайны вывела з акружэння танкавы полк. 19-50 — «Навіны». 20-05 — «Вёска ў пышаваннях». Рэйд-агляд Беларускага радыё і тэлебачання. Выступленне намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР У. Г. Каменскага. 20-20 — «На музычнай хвалі». 20-30 — інфармацыйная праграма «Час» (М). 21-15 — па заяўках тэлегледачоў. «Тайна двух акіянаў». Мастацкі фільм. Другая серыя. 22-20 — «Нарадзілася ў інтэрнаце песня». Пра маладзёжны хор інтэрната № 1 Мінскага аўтазавода. 23-00— «Толькі факты». Праграма перадач. «Музычны маяк». 23-15 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Сапрамат».

Другая праграма. 10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — «Камандзір бессмяротнага ўзвода». Тэлевізійны дакументальны фільм (М). 10-45 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Віншуем нашых мамаў». Канцэрт выхаванцаў дзіцячага сада (М). 17-05 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15 — акадэмія сельскагаспадарчых ведаў. «АТК хлебароба» (М). 17-45 — «Люстэрка». Мультыплікацыйны фільм (М). 18-00 — «Табе, юнацтва!». «Сюрпрыз для дзяўчат». Музычны агляд (М). 18-30 — па роднай краіне. «Тры дні на Сахаліне». Кінанарыс. 19-00 — «Лета ў Візівараш». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма. Другая серыя (Венгрыя) (М). 20-00 — «Слова пра адну рускую маці». Тэлевізійны дакументальны фільм (М). 21-30 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 22-15—«Вялікі тэатр і яго чэмпіёны». Тэлевізійны нарыс (М).

6 сакавіка

Першая праграма. 16-10 — «Навіны». 16-20 — праграма перадач. 16-25 — школьная фільматэка. «Мае універсітэты». Мастацкі фільм. 18-10 — «Не праходзьце міма». Выступленне начальніка Упраўлення аховы грамадскага парадку Мінгарвыканкома палкоўніка В. А. Піскарова. 18-30 — М. Ткачоў. «На беразе Сожа». Інсцэніраванае апавяданне. Перадача прысвячаецца 50-годдзю пісьменніка. 19-00 — «Сельскі веснік». 19-30 — эстраднае прадстаўленне. У перапынку — «Навіны». 21-30— футбол. На Кубак уладальнікаў кубкаў. «Кардыф-сіці» (Уэльс) — «Тарпеда» (Масква). Перадача з Англіі. У перапынку — «Толькі факты». Праграма перадач.

Другая праграма. 10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — «Медыцынскія парады» (М). 10-30 — «Людзі з гарачымі сэрцамі» (М). 11-00 — «Карусель». Музычная папулярная праграма (М). 11-45— «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 12-30—«Табе, юнацтва!» «Сюрпрыз для дзяўчат» (М). 17-05 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15—выступае танцавальны калектыў Рыжскага політэхнічнага інстытута «Вектар». Перадача з Рыгі. 18-00 — для школьнікаў. «Смехатрон». Перадача з Калінінграда. 18-30 — «Прапагандыст». Тэлевізійны часопіс (М). 19-00 — «Дзікі мёд». Мастацкі фільм (М). 20-35 — інфармацыйная праграма «Час» (М). 21-15 — «Старонкі музычнага календара». Ленінградскі дзяржаўны акадэмічны Малы тэатр оперы і балета (М).

7 сакавіка

Першая праграма. 10-30 — для вучняў другой змены. Школьная фільматэка. «Мае універсітэты». Мастацкі фільм. 15-50—«Навіны». 16-00 — праграма перадач. 16.05— для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Англійская мова. Урок 21-ы. 16-30 — «Дзённік пяцігодкі». 17-00 — праграма прысвячаецца Міжнароднаму жаночаму дню (М). 20-30 — інфармацыйная праграма «Час» (М). 21-15 — першынство СССР па хакеі. «Спартак» — «Дынама» (Масква). II і III перыяды (М). 22-15 — тэатральныя сустрэчы (М). 23-45 — для студэнтаў вну. «Фізіка».

Партарганізацыя і мясцовы камітэт Мастацка-вытворчага камбіната Мастацкага фонду БССР выказвае глыбокае спачуванне мастаку Навумаву Міхаілу Якаўлевічу з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці бацькі.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН (намеснік галоўнага рэдактара), А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра кіно і музыкі— 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 01124